Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

АНАТОЛЬ ПАРЭМБСКІ ☞ 8

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 35 (2520) Год XLIX | Беласток, 29 жніўня 2004 г. | Цана 2,00 зл.

У Нараўцы пра навучэнцаў беларускай мовы, кажуць: „найразумнейшыя” ў школе. Яны выдатнікі ў навуцы, пераможцы у мастацкіх і спартыўных конкурсах, аўтары краязнаўчых тэкстаў пра родныя вёскі...

Скарысталі і кінулі?

— Не, у Міхалова не аддамо дзяцей. Там няма беларускай мовы, — заяўляе па тэлефоне маці з Бандароў.

Кажа, што ў Міхалове не разумеюць ні праблемы, ні іхняга закіду:

— То ж ёсць у нас руская! — упіраюцца.

А мы ім на гэта:

— У Нараўцы ёсць і руская, і беларуская!

Гулялі да трэцяй уначы

Вось якія заядлыя патрыёты, — думаю пра бацькоў з Бандароў. Еду, вядома, на месца з надзеяй на добры артыкул. Аднак у святліцы, дзе раней дамаўляюся са згаданай маці, нічога не ведаюць.

— У мяне дачка ўжо закончыла гімназію і я не цікаўлюся школай, — просіць прабачэння бібліятэкарка, якая самотна выседжвае ў бібліятэцы. Пра сустрэчу з бацькамі чуе ўпершыню... ад мяне.

— Усё яшчэ жывем беларускім фэстам, — кажа. — У гэты раз як ніколі імпрэза ўдалася. Гулялі да трэцяй уначы. А цяпер думаюць як ахрысціць імпрэзу, каб была папулярная як „Сяброўская бяседа” ў Гарадку. Прапанаваны „Песенны базар” не ўсім даспадобы.

— А ці падпісваецеся, — мяняю тэму, — на „Ніву” ў біблятэку?

— Мы нават гміннай газеты не выпісваем, — чую шчырыя словы апраўдання.

Каб уцячы адсюль

На *аседлі* ў Бандарах усюды чуваць беларускую мову. Большасць жыхароў гэта перасяленцы з затопленых пад вадасховішча вёсак.

— Кожны думае каб адсюль уцячы ў Беласток, — заяўляе жанчына і просіць не называць яе прозвішча. Жыллё ў блёку абрыдла з-за высокага *чыншу*, месячная аплата ў сярэднім складае каля пяцісот злотых.

— І, ведаеце, — працягвае жанчына, — даймаюць у гміне, асабліва тады, калі хто ідзе за сацыяльнай дапамогай. Jak to tak, — кажуць, — do nas po pieniądze idziecie, a swoje dzieci to do Narewki wysyłacie!

— І мяне аднойчы наш войт спытаў куды дзяцей пашлю, — успамінае іншы бацька. — То яму кажу так: Kupi pan moją kwaterę, to i dzieci do Michałowa oddam.

Калі пытаю, ці на *аседлі* хтосьці з дзяцей вывучае беларускую мову, мае інфарматары паціскаюць плячыма.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Анна Марчук і Барбара Лясота з дзеткамі

— Мы то яшчэ вучыліся, — кажуць, — а цяпер?..

Няма праблемы

— Łukasz, wyłącz telewizor! — просіць сынка-першакласніка пані Аня. За акном грыміць ды ідзе дождж. Спадарства Анна і Міраслаў Марчукі ведалі пра сённяшнюю сустрэчу ў святліцы. Але сустракаемся ў іх кватэры. Тут жа на пасядзенках і пані Бася Лясота з сынком Кшысем.

> *Шкада толькі, што на беларускіх фэстах, на якіх збіраюцца тысячы беларусаў, арганізатары ні словам не заікнуцца пра родную мову ў школе...*

— Так папраўдзе, няма праблемы, — кажа бацька Лукаша. — Астанецца па-старому, значыць, большасць далей пойдзе ў Нараўку. Там новая школа, камп’ютэрная майстэрня, замежныя мовы. А ў Шымках што? Можа і ёсць адзін на ўсю школу камп’ютэр?!

Пра Міхалова і Новую Волю (таксама запрашаюць) няма што і гаварыць. У першай няма дысцыпліны, другую — усё закрываюць.

У Бандарах каля трыццаці вучняў. Дваццаць па жаданні бацькоў, пойдзе вучыцца ў Нараўку.

— Я сам вучыўся ў Нараўцы, то хай і дзеці вучацца, — кажа гаспадар. Сярод плюсаў і гадзіны ў якіх курсіруе аўтобус. У Шымкі забіраюць 6^{30} і прывозяць у 14^{30} — у Нараўку ў 7^{00} і прывозяць у 15^{00} пасля абеду.

Пытаю першакласнікаў Лукаша і Кшыся дзе яны хочуць вучыцца.

— У Нараўцы! — заяўляюць згодна. Чаму?

— Bo tam jest fajnie!

Спадарства Марчукі таксама не ўмеюць назваць навучэнцаў беларускай мовы на *аседлі*.

— Гэта было пяць гадоў таму, — ўспамінае пан Мірэк, — як хацелі перавесці дзяцей з Шымак у Нараўку. Казалі, што хочуць туды з-за беларускай мовы.

— А вы пашлеце сваіх сыноў на беларускую мову, — пытаю Анну і Мірслава Марчукоў ды Барбару Лясоту.

— Мы не супраць, — адказваюць згодна.

* * *

У Нараўцы пра навучэнцаў беларускай мовы, кажуць: „найразумнейшыя” ў школе. Яны выдатнікі ў навуцы, пераможцы ў мастацкіх і спартыўных конкурсах, аўтары краязнаўчых тэкстаў пра родныя вёскі.

Шкада толькі, што на беларускіх фэстах, на якіх збіраюцца тысячы беларусаў, арганізатары ні словам не заікнуцца пра родную мову ў школе!

Ганна Кандрацюк

Ідэалогія ☞ 2

Віктар Сазонаў

Яна ўжо ахапіла ўсе сферы грамадства. Прытым праца ідзе з вялікім размахам. На прадпрыемствах і ва ўладных кабінетах вертыкалі займелі пасады новыя ідэалагічныя работнікі...

Узнагарода, пакаранне ☞ 2

Ежы Плютовіч

Тое, што нам у неспакойнай Еўропе пагражае, гэта паўсюднае знікненне гістарычнага мышлення, у сувязі з гэтым наша культурная традыцыя становіцца незразумелай і чужой, амаль як цывілізацыя індзейцаў з Амазоніі...

Недаацэнка Бельшчыны ☞ 4

Міхал Мінцэвіч

Зацікаўленне турызмам на Бельшчыне ў вялікай меры вынікае са знаходжання павета ў абшары адметных прыроднымі каштоўнасцямі Зялёных лёгкіх Польшчы. Павет перасякаюць важныя камунікацыі і ляжыць ён у цэнтральнай частцы ваяводства...

Пошукі каранёў ☞ 5

Ганна Кандрацюк

— Мяне палохае тое, што людзі так лёгка аддаюць сваю зямлю. Прадаюць гаспадарку, а самі едуць дажываць у горад. На іхныя месцы пасяляюцца цалкам чужыя людзі. Яны звычайна не падтрымоўваюць сувязей з вёскай. Гародзяць высокія платы, вешаюць табліцу „teren prywatny” або напускаюць злосных сабак...

Паэтычная душа ☞ 9

— Паэтычнае натхненне не заўсёды прыходзіць тады, калі на зямлю апускаецца ціхая зорная ноч. Часам натхненне прыходзіць, калі гатуеш абед, і тады падгараюць катлеты... Але мушу кідаць гатаванне і хапаць гэтую хвіліну натхнення, таму што яна міне і разам з ёю знікне верш, які трэба паспець занатаваць...

Залатая ліхаманка ☞ 10

Уладзімір Хільмановіч

Што датычыць „няўдалага” выступу спартоўцаў, то нічога надзвычайнага не здарылася. Алімпійнікі ж не камбайны, а жывыя людзі. А залатая ліхаманка ў любой сферы дабром ніколі не скончалася. Вось і на гэтай алімпіядзе. Заявілі расіяне, што здабудуць ажно трыццаць залатых медалёў...

Запіскі кантрабандыста ☞ 10

Сымон Нальшанскі

У той час, калі заходнееўрапейскі тэлеглядач выў ваўком ад рэкламнага гвалту на яго любімых тэлевізійных каналах, грамадзяне сацыялістычных краін марылі хоць адным вокам убачыць што гэта такое...

9 770546 196000

Нябожчык на вакацыях

Ні адна краіна не можа абысціся без ідэалогіі. Расія ўзмацняе вялікадзяржаўны шавінізм, змагаецца за недапушчэнне свайго развалу, і пры мажлівасці, за паглынанне яшчэ кагонебудзь. Найперш Беларусь. Еўропа стварае ідэалогію аб'яднанага грамадства. Яна не супраць далучэння да яе, пры выкананні пэўных умоваў, усіх еўрапейскіх дзяржаваў. У тым ліку і Беларусі. Беларускія ж улады спрабуюць вынайсці сваю, і як усё, што яны вынаходзяць, „непаўторную" ідэалогію.

Яна ўжо ахапіла ўсе сферы грамадства. Прытым праца ідзе з вялікім размахам. На прадпрыемствах і ва ўладных кабінетах вертыкалі займелі пасады новыя ідэалагічныя работнікі. Падключаныя і дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі. Новая ідэалогія ствараецца з нуля. Нафталінавая настальгія па Савецкім Саюзе незваротна канае. Проста не прыжываецца ў грамадстве. Застаецца толькі ў прэзідэнтавых казках-успамінах пра савецкі дабрабыт. Ды і не адпавядае яна мэтам і задачам сённяшняга рэжыму. Папросту ў „аднаўленым былым СССР" многім не хопіць месца. На першыя пасады там прэтэндуюць расійскія „дзеячы". Як і пры варыянце аб'яднання Беларусі з Расіяй. У Еўропе для сённяшніх валадароў лёсу беларускага народа таксама не захавалі крэслаў. Многіх з іх ужо зараз нават не пускаюць туды. А як жа ім захаваць уладу?

Адказ просты. Паспрабаваць шчасця ў „адной асобна ўзятай краіне". А для гэтага патрэбна свая ідэалогія. Ды такая, каб нацкаваць грамадства на „ворагаў народа", давесці людзям, што ў нас найлепшае на свеце кіраўніцтва, а адпаведна і жыццё, найсправядлівейшае права. І сама галоўнае, каб можна было „па чэснаму" выйгрываць выбары.

Здаецца, што акрамя такога разумення ў ідэалогіі краіны больш нічога не засталося. Зверху зразумелі, што менавіта ў гэтай сферы вялікі прабел. Маўляў, да поўнага „шчасця" беларусам не стае якраз сістэматызацыі ідэалагічнае працы. Хіба так там разумеюць словы: „не хлебам адзіным...". Вектар новай працы вызначыў сам прэзідэнт.

Ідэалогія на рэспубліканскім тэлеканале цалкам адпавядае новым патрабаванням. Зразумела, ні пра вялікага дзяржаўнага дзеяча беларускай мінуўшчыны Льва Сапегу, ні пра вялікую паэтку Ларысу Геніюш ні слова. Гэтак, як і пра Віктара Каліноўскага, ідэолага нацыянальна-вызвольнага паўстання 1863 года, які быў адным з тых, хто закладаў падмуркі нашага сённяшняга разумення беларускай нацыянальнай ідэі, як і пра яго малодшага брата Кастуся. Ні слова пра БНР, Слуцкае паўстанне... Афіцыйная дзяржаўная тэлевізія такой беларускай нацыянальнай ідэалогіі не заўважае. Затое прыдумвае штосьці новае, якое даходзіць да абсурду. Нацыя ў нас аказваецца, шматнацыянальная, а народ шматнародны.

Інфармацыйная плынь апошняга года нагадвае „славутыя" сталінскія часы, калі інфармацыя была безальтэрнатыўная, і ніхто не меў права паставіць яе пад сумнеў. Здаецца, што заляжалага нябожчыка на кароткі час адпусцілі на вакацыі. Ён з усіх сіл стараецца дарабіць тое, што не ўдалося пры жыцці, добра ведаючы, што вакацыі хутка скончацца.

Наша гісторыя скажаецца каб пазбыць беларусаў памяці. Без яе лягчэй прыжываюцца найпачварнейшыя ідэалагічныя сістэмы, нават, калі яны падобныя да таго трупехлага нябожчыка, якога адпусцілі на вакацыі. Без яе людзі забываюцца, хто яны, і не могуць знайсці правільных шляхоў змагання за сваю будучыню. Ім застаецца толькі пагадзіцца з рэчаіснасцю і ўсё жыццё наракаць на лёс.

А наракаць на лёс — гэта тое самае, што падаваць у суд на сябе. Кожны дзень дае шанц на змены і трэба быць да іх гатовым. Ніякая ілжывая ідэалогія не можа заблытаць чалавека, калі ён задае сабе ясныя і простыя пытанні. І тады, якую ні прыдумвай штучную і пачварную ідэалогію, мы, беларусы, усё адно застаемся старажытнай еўрапейскай нацыяй, якая здаўна мела сваю дзяржаву, сваю ідэалогію і сама вызначала свой лёс. Нішто не змагло знішчыць нашай тоеснасці: ні няволя, ні жахлівыя рэжымы, ні крывапралітныя войны. Па вялікім рахунку мы не толькі іх перажылі, не толькі выжылі, але і выйгралі.

Найстрашнейшая вайна на свеце — гэта вайна, якая штохвіліны ідзе ў душы кожнага чалавека, вайна дабра са злом. І галоўнае ў ёй — не памыліцца, навучыцца адрозніваць дабро ад зла, выбраць добры бок. І тады ніякія ідэалагічныя сістэмы не задураць нам галавы. Вакацыі ў нябожчыка скончацца, аджылае саступіць месца праўдзе.

Віктар Сазонаў (Гродна)

Час узнагароды, час пакарання

Жывем мы, вось, у цікавыя часы, а будучыня прадказваецца яшчэ больш цікавая, — любіць паўтараць мой сябра, паэт-постмадэрніст і ўго голасе гучыць перасцярога. (Травестуе яўрэйскі праклён: „А каб жыў ты ў цікавыя часы!"). Паэт спасылаецца прытым на індыйскую традыцыю, згодна з якой жывем мы сёння ў эпоху Калі-юнга, значыць, у „цёмную эпоху", бязладдзя, упадку і дэкадансу, дэструкцыі ўсіх каштоўнасцей. Індыйская багіня Калі — багіня смерці, якая мае выклікаць жах, прадстаўляюць яе ў вянцы з чалавечых чарапоў на шыі. Але, як заўважыў румынскі рэлігіязнаўца Мірчэа Эліядэ, веравызнаўцы ўсхваляюць Калі як багіню ласкавую ды міласэрную.

У нашым цывілізацыйным кругу няраз прадстаўляецца Бога Старога Запавету як суворага, мсцівага, бязлітаснага пакараючага няшчасных прадстаўнікоў чалавечага роду на найменшыя правіны і супрацьпастаўляецца быццам бы лагоднаму Богу Новага Запавету. Ёсць такія, што Бога Старога Запавету абвінавачваюць у недахопе міласэрнасці і тыя папрокі носяць антысеміцкі прысмак. Здаюцца яны забываць, што да Старазапаветнага Бога маліўся Ісус Хрыстос. Праблему боскай магутнасці прабавалі вырашыць шматлікія Айцы Царквы і ўсведамлялі яны вялікую тайну. Тая праблема ў нашу бедную, матэматычна-тэхнічную эпоху ўспрымаецца лёгкаважна, адкідваецца як малаважная, малаістотная, наколькі размінаецца яна з навуковымі тэорыямі.

Мой знаёмы пенсіянер-прафесар за нашым часам назірае паблажліва. Мае дачыненне з чымсьці такім як шавінізм сучаснасці — кажа. Наш час трактуецца як штосьці выключнае ў гісторыі чалавецтва, паколькі дайшло да жахлівых сусветных войнаў, да галакосту, генацыду, да фашызму і сталінізму, тым часам хопіць сягнуць да твора „Пелапанеская вайна" гісторыка старажытнай Грэцыі Фукідыда, каб пераканацца, якую сучасную (зверскую) палітыку вялі старажытныя грэкі. Пелапанеская вайна была змаганнем двух магутнасцей старажытнага свету — дэмакратычных Афін і таталітарнай Спарты, аналогія з сучасным часам навейваецца сама. У гісторыі чалавецтва эпохі гвалту і дэструкцыі наступалі наперамен з эпохамі супакаення, пільнай працы і будавання.

Тое, што нам у неспакойнай Еўропе пагражае, гэта паўсюднае знікненне гістарычнага мышлення, у сувязі з гэтым наша культурная традыцыя становіцца незразумелай і чужой, амаль як цывілізацыя індзейцаў з Амазоніі, якіх абмінуў прыспешаны прагрэс, захавалі сваю культуру ў нязменнай ад вякоў форме.

У гісторыі нашай Еўропы перапляцаюцца затым перыяды спакою, класіцызму з перыядамі гвалту і рамантычнага бунту.

Ганьбаванне Еўропы як гнілога Захаду сёння найбольш красамоўна выказваюць інтэлектуалы звязаныя з рухам ісламістаў, але не так і рэдка ганьбуюць ёю адукаваныя еўрапейцы, няраз з багатых сем'яў. Таму гавораць аб іх як аб „шампанскіх сацыялістах".

Сімвал нашага часу — той Усама бен Ладэн, створаны — як здаецца — медыямі. Стаў ён персонай з тэлевізійнага шоу. Явіцца перад гледачамі ён як той таямнічы, багаты ды статны асобень, патрабуючы пакарання для нас, еўрапейцаў, для нашых дзяцей і нашых продкаў. За правіны здзейсненыя і няздзейсненыя.

Ежы Плютовіч

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Вачыма еўрапейца

Вярнуцца на кругі свае

На нейкім уздыме аглядаю канчатак XXVIII сучасных Алімпійскіх гульняў у Афінах. Гульні пасля больш за сто гадоў вярнуліся да крыніц і традыцыі, якія ініцыявалі у 1896 г. П'ер дэ Кубертэн, а якія былі спынены ў 394 г. нашай эры. Вярнулася ўсё на свае кругі. Красамоўна было гэта відаць у час урачыстасці адкрыцця. У падрыхтаваным з агромным размахам відовішчы прыгаданы былі старажытныя сімвалы і ідэі, якія сёння свету вельмі патрэбныя — як гэта акрэсліў шэф Міжнароднага алімпійскага камітэта бельгіец Жак Рог — міру, талерантнасці ды братэрства. Вядома, у той час у элінскай штодзённасці няраз іх таксама не хапала, але якраз у час гульняў у Алімпіі якраз яны спадарожнічалі спартыўным змаганням, якія тады шырока разумеліся. У 2004 г. у Афінах з'явіліся 202 нацыянальныя зборныя каманды. Цяжка сабе ўявіць, каб у 2004 г. падзея, якая ахоплівае ўвесь зямны шар, з усёй ягонай разнароднасцю нацыянальнасцей, рэлігій, ці ўрэшце часовых палітычных і эканамічных інтарэсаў, магла б стаць нагодай спыніць на тыя два тыдні войны, нелады, спрэчкі — міжрэлігійныя, нацыянальныя і іншыя. Пры нагодзе сёлетніх афінскіх гульняў паказалі гэта ЗША, яшчэ раней рашуча і адназначна выключаючы магчымасць увесці на той час перамір'е ў Іраку. Аднак, дзякуючы Міжнароднаму алімпійскаму камітэту спартсмены паказалі, што свет прынамсі не забыўся аб найважнейшых каштоўнасцях. Хоць бы тады, калі на стадыёне ў Афінах у час інаўгурацыі алімпіяды крочылі зборныя толькі ў пару асоб з краін, ахопленых ваеннымі неспакоямі, як Сьера-Леоне, Судан ці якраз Ірак, якіх 70 тысяч гледачоў грэчаскай публікі прынялі з авацыяй. Вельмі красамоўным жэстам быў марш сцяганосцаў, трымаючых супольна сцягі Паўночнай і Паўднёвай Карэі. Воплескамі прымаліся „моцныя" зборныя, якія ішлі ў шэрагу іншых краін — Кубы ці Беларусі, якіх улады на штодзень успрымаюцца як недэмакратычныя. У Афінах другой паловы 2004 г. гэты палітычны маштаб зышоў на другі план. Хоць ён даваў знак на сучасных алімпіядах у Маскве 1980 г., якую шмат краін заходняга свету байкатавала (некаторыя зборныя выступілі пад алімпійскім сцягам) і чатыры гады пасля ў Лос-Анжэлесе, дзе ў „помсце" не з'явіліся спартсмены з краін Варшаўскага дагавора (апрача Румыніі).

На пачатку XXI стагоддзя афінскую алімпіяду засцілі справы масавага допінгу спартсменаў і хабарніцтва сярод спартыўных дзеячаў. Верыць трэба, аднак, што і з гэтай праблемай алімпійскі спорт справіцца. Мабыць, якраз таму выбраны былі на XXVIII Алімпійскія гульні Афіны, сталіца Грэцыі, якая дала свету „галовы *mącicieli*" і дэмакратыю.

У першы дзень алімпійскіх змаганняў памёр у Кракаве ў 93-гадовым узросце лаўрэат Нобелеўскай прэміі, паэт, пісьменнік, нарысіст, перакладчык Чэслаў Мілаш. Жыццё гэтага — як гэта акрэсліў іншы выбітны паэт Адам Загаеўскі — прарока, мудраца, аўтарытэта для пакаленняў — вярнулася на кругі свае. Спасылаючыся на думку расійскага калегі па пяры Іосіфа Бродскага, гаварыў ён:

— Бродскі казаў, што трэба пісаць так, каб гэта падабалася нашым продкам. Я пішу так, каб гэта падабалася Міцкевічу.

Значыць, нашаму беларуска-літоўска-польскаму продку. У „Трактаце маральным" (1947 г.) Чэслаў Мілаш пісаў па-польску ў Вашынгтоне:

Żywot grabarza jest wesoły.
Grzebie systemy, wiary, szkoły,
Ubija nad tym ziemię gładko
Piórem, naganem czy łopatką,
Pełen nadziei, że o wiośnie
Cudny w tym miejscu kwiat wyrośnie.
A wiosny nima. Zawsze grudzień.
Nie rozpraszajmy jednak złudzeń.

У перакладзе Міры Лукшы гучыць гэта так:

Жыццё далакопа — вельмі вясёлае.
Сістэмы хавае ён, веры і школы.
Зямельку прыклепле ён роўна, гладка
Пяром, наганам альбо лапаткай.
Поўны надзеі, што ўжо пад лета
На гэтым вырасце шмат цуда-кветак.
Вясны нямашка. Снежань заўсёдны.
Мрояў не будзем развейваць шкодна.

Мацей Халадоўскі

Масква перабудоўваецца на еўрапейскі ўзор. Дзень і ноч гараць рэкламныя шчыты і вітрыны магазінаў. На вуліцах аўтамабільная плынь іншамарак. Бары, рэстараны, казіно, гульнявыя аўтаматы, банкі, валютныя абменнікі — прыкмета цяперашняй Масквы...

Масква вачыма гастарбайтара

Жыхар Свіслачы Анатоль ВАЛЮК — паэт, публіцыст, колішні дэпутат райсавета, многа гадоў працаваў журналістам, настаўнікам. З-за сваёй актыўнай грамадскай дзейнасці страціў працу ў школе. Зараз, як і многія іншыя беларусы, на часовых заробках. Вярнуўшыся з Масквы, Анатоль расказвае пра сваю працоўную эпапею, дзеліцца ўражаннямі пра сталіцу расійскай дзяржавы.

Стаць беспрацоўным вельмі проста

— Застацца ў наш час без сталай працы вельмі проста, знайсці яе даволі складана, асабліва ў правінцыйных гарадках, такіх як Свіслач, дзе няма вялікіх прадпрыемстваў. Таму ў пошуках заробку многія жыхары едуць у замежжа па лепшую долю — хто на Захад, хто на Усход. Мае сябры ўжо больш двух гадоў працуюць у Маскве, атабарыліся там, маюць неблагі заробак. Таму калі паўстала праблема працаўладкавання ў мяне, запрасілі паехаць з імі. Пасля доўгага роздуму я пагадзіўся...

...У сярэдзіне студзеня бягучага года а дзевятай раніцы экспрэс „Нёман", пераадолеўшы прастору ў тысячу пяцьсот кіламетраў, спыніўся на пероне Беларускага вакзала расійскай сталіцы. З гэтага моманту пачалася мая працоўная эпапея гастарбайтара. Масква, яшчэ з 1990 года засталася ў маёй памяці агромністым і неахайным чалавечым мурашнікам, дзе кожны мусіў адстаяць пэўную чаргу па кавалачак шчасця ў выглядзе нейкага дэфіцыту: віна, гарэлкі (якраз вялася антыалкагольная кампанія), тавараў побыту, іншых рэчаў. Нават у маўзалей Леніна трэба было займаць чаргу з раніцы, каб апоўдні глянуць на мумію правадыра галодных і рабоў. У тыя часы паўсюль на сценах будынкаў віселі плакаты, чырвоныя палотнішчы з надпісамі кшталту „Пралетарыі ўсіх краін яднайцеся!", „Партыя і народ адзіны". Па вуліцах гойсалі аўтамабілі савецкай вытворчасці. Шмат было адміністрацыйных будынкаў, дзе няблага сябе пачувала савецкая наменклатура.

Масква перабудоўваецца

Цяпер нічога падобнага няма — Масква перабудоўваецца на еўрапейскі ўзор. Дзень і ноч гараць рэкламныя шчыты і вітрыны магазінаў. На вуліцах аўтамабільная плынь іншамарак. Бары, рэстараны, казіно, гульнявыя аўтаматы, банкі, валютныя абменнікі — прыкмета цяперашняй Масквы. Прыкметна паболела на вуліцах расійскай сталіцы ўзброеных аўтаматамі міліцыянтаў, жабракоў і бамжоў. Між тым адчуваецца нейкая напружанасць і заклапочанасць на тварах людзей. І гэта не дзіва. Там ідзе сапраўдная крымінальная вайна. Кожны дзень у навінах згадваецца то пра зладзейскія разборкі, то пра напады на гандлёвыя кропкі, то пра тэрарыстычныя акты. Неўзабаве пасля майго прыезду і ўладкавання (працавалі мы на рэстаўрацыі адміністрацыйнага будынка Усерасійскага футбольнага саюза ля станцыі метро Таганская) паблізу адбыўся магутны выбух у метро, дзе загінула звыш ста пяцідзесяці чалавек. Нават такой жахлівай сітуацыяй скарысталіся бамжы-марадзёры, якія пасля здарэння прарываліся праз кардоны міліцыі і расцягвалі рэчы забітых і параненых. Пра гэта пісалася ў газетах, але мала ў якіх.

Масква — агромністы мегаполіс з насельніцтвам удвая большым, чым насельніцтва ўсёй Беларусі. Прычым там яшчэ нелегальна пражывае вялізная армія наёмных рабочых з розных краін свету і далёкіх куткоў Расіі. Шмат там працуе і беларусаў, асабліва на будоўлях. Многія з іх здымаюць кватэры, жывуць у інтэрнатах або проста ў вагончыках. Будаўнічыя арганізацыі ахвотна бяруць іх на працу, таму што звычайна гэта людзі, якія маюць пэўную спецыяльнасць і адпаведную кваліфікацыю, могуць выконваць даволі складаныя работы, асабліва высотныя, якасна рабіць рамонт кватэр. Адзіная праблема для адміністрацыі — рэгістрацыя нанятых працаўнікоў. Калі я ўладкоўваўся на працу, начальніца аддзела кадраў скардзілася на тое, што Пуцін з Лукашэнкам ніяк не могуць дамовіцца аб падпісанні працоўнага пагаднення паміж дзвюма краінамі, каб легалізаваць рынак працы.

Ганаровы наведнік

На будаўнічы аб'ект давялося патрапіць якраз тады, калі ішла падрыхтоўка да наведвання яго мэрам Масквы Лужковым. З гэтай нагоды рабочыя выконвалі не сваю працу, а чысцілі снег, выкладвалі драўляныя насцілы-дарожкі, ставілі агромністы шацёр для ганаровага наведніка, вешалі рэкламныя шыльды. Трэба адзначыць, што жонка Лужкова кантралюе будаўнічы бізнес Масквы і Падмаскоўя, укладаючы ў яго вялізныя сродкі. Таму зразумела, што начальства на будоўлі хвалявалася, спешнымі тэмпамі парадкавалі тэрыторыю. На чацвёрты дзень пасля майго прыезду на пляцоўцы з'явіўся Лужкоў. Але ненадоўга, хвілін на дваццаць. Паглядзеўшы макет будынка, папіўшы кавы, з'ехаў. Мы (тыя, хто не меў фірмовай спецвопраткі) часам візіту назіралі за дэлегацыяй з вышыні хмарачоса, куды нас схавалі.

> *Масква — агромністы мегаполіс з насельніцтвам удвая большым, чым насельніцтва ўсёй Беларусі. Прычым там яшчэ нелегальна пражывае вялізная армія наёмных рабочых з розных краін свету і далёкіх куткоў Расіі. Шмат там працуе і беларусаў, асабліва на будоўлях...*

Толькі з ад'ездам мэра пачаліся асноўныя работы. Мяне ўключылі ў брыгаду бетоншчыкаў-арматуршчыкаў, якая займалася ўстаноўкай ліфтавых шахтаў і лесвічных пралётаў. Працаваць даводзілася на вышыні, рабочы дзень доўжыўся дзесяць гадзін (з васьмі раніцы да васьмі вечара) з невялікімі перапынкамі на абед і вячэру. Харчаваліся самі. Пасялілі нас у інтэрнаце ў „прэстыжным" раёне Кунцава разам з прусакамі і мышамі, якіх там было процьма. У маім пакоі жыло восем чалавек, былі і такія, дзе месцілася і па дваццаць асоб. З выгодаў — тры кабінкі ў прыбіральні, адзін душ прыкладна на сотку чалавек. Катастрафічна бракавала электраплітак. Пасля працы даводзілася адстаяць у чарзе, каб нешта згатаваць назаўтра.

Каб трапіць своечасова на працу, выязджалі з інтэрната а палове сёмай раніцы, а вярталіся з-за аўтамабільных коркаў толькі каля дзесятай-адзінаццатай. Зразумела, што моцна стамляліся і не дасыпалі. Іншая „бяда" чакала часам раніцой па дарозе на працу ў выглядзе дарожнай інспекцыі з аўтаматамі. Яна спыняла аўтобус і пачыналася праверка пашпартоў на рэгістрацыю. Калі ў каго яе не было, забіралі ў пастарунак. Звычайна за гэта альбо штрафавалі, альбо, пратрымаўшы тры гадзіны, адпускалі.

Касцяк брыгады — беларусы

Пераважна касцяк нашай брыгады з пяцідзесяці чалавек складалі беларусы са Свіслаччыны і Случчыны (нас так і называлі — брыгада СС), былі хлопцы з памежных Беларусі Разаншчыны і Смаленшчыны, якія размаўлялі амаль па-беларуску, з Алтаю, з Калмыкіі, Мардовіі, працавала некалькі маскоўцаў-пенсіянераў. Уладкоўваліся на працу часамі сем'ямі — прыкладам, бацька з сынамі. Калектыў падабраўся даволі працаздольны, але заўсёды знойдзецца паршывая авечка. Былі і схільныя красці і празмерна выпіць. У побытавых размовах не абыходзілася без закранання палітычных тэмаў. Якраз былі выбары прэзідэнта Расіі Пуціна. Гаварылі пра газавы канфлікт паміж Расіяй і Беларуссю. Што цікава, бальшыня расійцаў выказваліся супраць Лукашэнкі.

Плацілі за працу нядрэнна — за два тыдні можна зарабіць і восем тысяч расійскіх рублёў (каля 270 долараў, праўда, каля 35 долараў вылічваецца за інтэрнат і столькі ж за рэгістрацыю). Але даводзілася сустракаць і людзей, якіх элементарна падманвалі — прыкладам, за пяць месяцаў працы атрымвалі ўсяго па 5 тысяч расійскіх рублёў. У суботу мы працавалі да трох гадзін дня, у нядзелю адпачывалі. Сярод нашых былі вернікі, якія стараліся па нядзелях наведваць храмы, імкнуліся мы пазнаёміцца з гістарычнымі мясцінамі. Характэрна, што да беларусаў маскоўцы ставяцца намнога лепш, чым да ўкраінцаў. Відаць таму, што Украіна вядзе ў дачыненні да Расіі больш прынцыповую палітыку.

Маскоўцы на будоўлях працаваць не хочуць

Самі маскоўцы (карэнныя жыхары) на будоўлях працаваць не вельмі хочуць. Мясцовыя аддаюць перавагу працы ў іншых сферах, дзе зарабіць лягчэй і больш. Уражваюць вялізныя маскоўскія рынкі, дзе можна значна танней набыць тавар, чым у дзяржаўных крамах. На рынках вельмі шмат гандляроў-каўказцаў, малдаван. Ёсць раёны, дзе гандаль трымаюць у сваіх руках чачэнцы, якіх, аднак, па знешнасці распазнаць цяжка. На выгляд яны мала чым розняцца ад славянскіх народаў. Часта за чачэнцаў прымаюць прадстаўнікоў зусім іншых нацыянальнасцей. Міліцыянты зарабляюць даволі мала — менш ста долараў. Для Масквы гэта нішто. Дзяржава штучна стымулюе міліцыянтаў да карупцыі. Чаго вартая хаця б нашумелая справа пра „пярэваратняў у пагонах", калі супольна з Інтэрполам былі арыштаваныя каля ста начальнікаў дарожна-паставой службы, якія самі кралі машыны і іх прадавалі альбо афармлялі фальшывыя дакументы. Што датычыць бандытаў, то гастарбайтары іх не цікавяць. Бандыты „палююць" на банкаўцаў і бізнесоўцаў. А ўвогуле, Масква — гэта такі горад, дзе праўды і справядлівасці не знойдзеш.

Занатаваў Уладзімір Хільмановіч

Будуць фэсты

У Новай Волі...

28 жніўня ў 16 гадзін распачнецца фэст пры Пачатковай школе ў Новай Волі (Міхалоўская гміна). Ужо ў 14 гадзін распачнуцца спартыўныя спаборніцтвы футбольных каманд. Ад 16 гадзіны будуць мастацкія выступленні вакальнага калектыву з Гміннага цэнтра культуры, спорту і адпачынку з Міхалова, а таксама дзяцей з Новай Волі. У 17 гадзін распачнуцца сямейныя конкурсы. Будзе перацягванне каната ды конкурс на найсмачнейшае пірожнае спечанае нававольскімі жанчынамі. У 18 гадзін прыедуць на выступы беларускія мастацкія калектывы. Вечарам пачнецца народнае гулянне пад гукі аркестра „Casanova".

... і ў Старым Ляўкове

У нядзелю, 29 жніўня ў 14 гадзін пачнецца беларускі народны фэст у Старым Ляўкове (Нараўчанская гміна). На сцэне ў тамашнім амфітэатры гасцінна выступіць ансамбль „Бераставіцкія музыкі" з Бераставіцы (Беларусь). Зайграюць і заспяваюць эстрадныя маладзёжныя гурты „Лучына" і „Зорка" з Беластока. Выступяць яшчэ мясцовыя „Цаглінкі", „Нараўчанкі" з Нараўкі ды капэла з Дубін.

(мох)

Дапамога Елянцы

На дапамогу разбуранай ліпнёвым ураганам вёсцы Елянцы ўключыліся ўлады і жыхары Гайнаўскага павета. Нараўчанская гміна за ўласныя сродкі закупіла ў ляўкоўскім керамічным прадпрыемстве 840 цагляных пустакоў і гмінным транспартам завезла іх у Дубіцкую гміну.

Паасобныя салэцтвы Нараўчанскай гміны таксама збіралі грошы для Елянкі. Між іншым, солтыс Альхоўкі сабраў ад жыхароў 419 злотых і пералічыў іх на банкаўскі рахунак.

Людзі разумеюць, што трэба дапамагаць пацярпелым ад стыхіі. Народная прымаўка гаворыць, што сапраўдных сяброў пазнаем у бядзе.

Мікалай Варанецкі

Кніжкі Музею

У нядзельную раніцу, 8 жніўня г.г., пазваніў мне Міхал Голуб з Гайнаўскага беларускага музея. Спачатку спытаў ці глядзеў я беларускую тэлепраграму „Беларускі тыдзень" — На хутары „Дзядзькі Кваса". Калі я пацвердзіў, тады ён спытаў ці праўда гэта, што Квасава сям'я хоча каму-небудзь перадаць хатнюю бібліятэку пакойнага Міхала Красоўскага. Мой сын (Квасаў зяць) выказваўся аб гэтым і, думаю, што гэта праўда. Даў я Міхалу Голубу нумар тэлефона да дачкі Дзядзькі Кваса, Тамары. На маю думку, гэта вельмі добра, што кніжкамі пацікавіўся спадар Голуб, бо шкада, каб такая бібліятэка нішчэла ў каморы ды на гарышчы Квасавай хаты. Хаця там большасць рускамоўных кніжак, але, думаю, гэта цікавыя і каштоўныя для музея кніжкі.

Мікалай Лук'янюк

Турыстычная недаацэнка Бельскага павета

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Маляўнічы масток між Грабаўцам і Стрыкамі

Як паведамляе Рада Бельскага павета ў мясцовым плане загаспадарання, агульная падгатоўка павета да прыёму турыстаў нездавальняючая. У наваколлі Бельска раскінуліся цудоўныя абшары прынарваўскіх багнаў, прыгожыя краявіды, расліннасць, птаства, грыбныя лясы. Мясцовае прыроднае асяроддзе слаба дэградаванае гаспадарчаю дзейнасцю людзей, а помнікі матэрыяльнай культуры сведчаць пра цікавую гісторыю Бельшчыны і Падляшша.

Зацікаўленне турызмам на Бельшчыне ў вялікай меры вынікае са знаходжання павета ў абшары адметных прыроднымі каштоўнасцямі Зялёных лёгкіх Польшчы. Павет перасякаюць важныя камунікацыі і ляжыць ён у цэнтральнай частцы ваяводства, якога амаль 40% тэрыторыі ахоплена аховай. Прыроднае асяроддзе павета вылучаецца на фоне краіны выдатнымі адметнасцямі. Гэта лясныя комплексы з захаванымі дрэвастоямі, рэкі з чыстаю вадою, багатыя фауна і флора. Недалёка знаходзіцца і найстарэйшы польскі Белавежскі нацыянальны парк. На тэрыторыі павета налічваецца каля шасцідзесяці помнікаў прыроды: дрэў і валуноў. Багаты ў якасным і колькасным плане птушыны свет даліны Нарвы, асабліва тае часткі, якая ўвайшла ў склад Нарваўскага краявіднага парку. Несумненнай візіткай рэгіёна з'яўляецца вадасховішча „Семяноўка" і месца ў межах Краіны зубра.

Найважнейшыя турысцкія козыры

— павет недалёка ад Белавежскага нацыянальнага парку;
— даліна ракі Нарвы на поўначы;
— даліна ракі Нурэц на поўдні;
— блізкае з поўдня суседства запаведніка прыроды „Карыціна";
— адметная планіроўка вёсак;
— месца ў межах Краіны зубра.

Турысцкая база павета

У Бельскім павеце дзейнічае чатыры гатэлі: тры ў самым Бельску і адзін у Плёсках. Нямнога начлежных месцаў і ў агратурыстычных кватэрах. Ды ў агульным плане Бельскі павет непрыцягальны турыстам. Галоўнымі турысцкімі недахопамі з'яўляюцца:

— кволая начлежная і бытавая база;

— адсутнасць трасіраваных турысцкіх і камунікацыйных шляхоў па найцікавейшых мясцовасцях павета;

— недаступнасць вартых увагі аб'ектаў для турысцкага пазнання;

— адсутнасць санітарнай інфраструктуры побач галоўных дарожных магістралей.

Да вышэйсказанага трэба дадаць благі тэхнічны стан турысцкіх каштоўнасцей, які патрабуе значных капіталаўкладанняў на іх мадэрнізацыю.

Міхал Мінцэвіч

Ідэалагічны апетыт

Сёлета ў Польшчы адзначаецца шасцідзесятая гадавіна Варшаўскага паўстання. Старонняму назіральніку можа яно бачыцца не надта сэнсоўным мерапрыемствам не толькі з ваеннага пункту гледжання. Непадрыхтаванае палітычна прынесла яно ў выніку не толькі смерць каля двухсот тысяч жыхароў сталіцы, але і разбурэнне яе забудовы, што прадумовіла пазнейшы яе выгляд разам з архітэктурным сімвалам — Палацам культуры і навукі імя Іосіфа Сталіна. Сёння шмат хто з польскіх эліт абураецца на прысутнасць гэтага збудавання, ёсць і галасы за яго раскіданнем. Па сутнасці ж, у адрозненне ад Беластока, дзе саветы пад помнік Сталіну самыя раскідалі гістарычную ратушу, у Варшаве месца пад помнік слаўнаму правадыру запрацавалі ягоныя заўзятыя праціўнікі.

Нягледзячы на адсутнасць прамога ваеннага сэнсу паўстання, адсутнічае ў Польшчы таксама і крытыцызм у адносінах да яго ініцыятараў. Дзеецца затое ж зусім наадварот — іхнімі імёнамі паўсюдна называюцца гарадскія вуліцы, мабыць і асветныя ўстановы; імёны гэтыя занесены ў лік нацыянальных святасцей. Адбываецца ўсё гэта ў рамках стэрэатыпнага ўсхвалення нацыянальнага гераізму, гераізму без аглядкі на якасць і колькасць ахвяр. Тут шчыруюць і левы прэзідэнт дзяржавы, і правы прэзідэнт сталіцы. Нават удзельнікі той збройнай імправізацыі безрэфлексійна захоплены сваім хвацкім запісам у гісторыю, які мне нагадвае прарыў у тую ж гісторыю славутага Герастрата. Ці тыя дзвесце тысяч ахвяр паўстання былі рады такой развязцы? Магчыма, што яны ўсе былі за і супраць, як метка пры іншай нагодзе сказаў быў ранейшы прэзідэнт.

Гэтае бачанне паўстання адным толькі вокам не вынікае, як найлягчэй дадумацца, з крывадушніцтва, з карыслівай прагі ўзабрацца ці то на мармуровы п'едэстал, ці на важнае крэсла. Гэта таксама стварэнне нацыянальнай міфалогіі, мацаванне нацыянальнай будучыні, яно надзейна прысутнае ў падручніках па гісторыі. Нацыянальную міфалогію будуюць не толькі палякі; калі добра прыглянуцца, яе будуюць бадай усе нацыі. Ад гэтага працэсу, які часта можа паказацца пазбаўленым логікі, не аднекваюцца і іх эліты. Пра Жанну д'Арк, Вільгельма Тэля, Ламараля Эгманта больш-менш ведаем. Крыху ведаем і пра Івана Сусаніна, і пра жыхарку Смаленшчыны Васілісу Кожыну...

А што мы ведаем пра пахаваных у Курапатах? Або хаця б пра Усяслава Чарадзея? Мяркую, што дарма пра іх шукаць звестак у падручніках суседзяў. Мо тады незалежная дзяржава, што нядаўна ўзнікла на беларускай тэрыторыі, клапоціцца пра давядзенне да свядомасці насельніцтва яго мінуўшчыны? Дзеля мацавання тае свае незалежнасці? Гледзячы на стаўленне дзяржаўных мінскіх улад да курапацкай брацкай некраполіі складана даць станоўчы адказ. І душэнне спадчыннай мовы вельмі адрозніваe ўладароў Беларусі ад суседзяў...

Нацыянальную міфалогію, як праяву шкоднага нацыяналізму, мінскія ўлады рашылі падмяніць яе бутафорыяй — дзяржаўнай ідэалогіяй. На пытанне, чым мае быць тая дзяржаўная ідэалогія, спрабаваў даць адказ Аляксандр Лукашэнка ў адным са сваіх выступленняў у сакавіку мінулага года. Ён там з некаторай насмешкай выказаўся пра „Рухнаме" — звод усіх мудрасцей Туркменбашы, дзе даюцца нават указанні наконт прымання родаў. Аляксандр Рыгоравіч таксама сказаў, што ён адрокся ад падказак, каб за дзяржаўную ідэалогію прыняць зборнік усіх ягоных прамоў. Асновай дзяржаўнай ідэалогіі Бацька палічыў наяўнасць ва ўсіх грамадскіх арганізацыях Беларусі камандзіраў і палітрукоў; так ён, вядома, гэтага не назваў, але такая сутнасць ягоных разважанняў. Галоўнай жа роляй палітрукоў у бальшавіцкай задуме было даносчыцтва і тая задума, як паказалі далейшыя падзеі, дала багаты ўраджай. Алтаром ахвярапрынашэнняў сталі і Курапаты, і Салаўкі, і Калыма...

У Брэсце, у мясаапрацоўчай фірме з польскім, значыць замежным капіталам, складана ці нават і немагчыма было б устанавіць штатнага даносчыка. Такая фірма, як і незалежныя газеты, была б шкодным пустазеллем у чысценька таталітарнай дзяржаве. Таму любой цаной патрэбнае селектыўнае яе і ёй падобных абвінавачванне. Ідэалогія патрабуе чарговых ахвяр. Быццам як у суседзяў...

Аляксандр Вярбіцкі

У пошуках каранёў

— Тут жывы кантакт з жывым беларускім асяроддзем, — кажа Ілона Карпюк. Тут, значыць, у Кленіках. Каля будынка школы, дзе зараз беларуска-маладзёвая станіца, чакаюць ужо дзяўчаты і хлопцы. Найбольш студэнтаў. Пасля сустрэчы з радыёжурналістам Яраславам Іванюком пойдуць па людзях. Запішуць успаміны часоў нямецкай акупацыі, сфатаграфуюць этнаграфічныя цікавіны, паразмаўляюць па-свойму.

— Кожны дзень ідзем у іншы бок, — кажа Таня Казак, студэнтка гісторыі Гродзенскага універсітэта. Тані запамятаўся расказ бабулі. Каб не ехаць у Нямеччыну, яна ды іншая моладзь з Кленікаў да крыві збівалі сябе ядлоўцам. — Маю бабульку ўсё роўна вывезлі, — заключае гродзенская студэнтка.

Яшчэ да прыезду ў Кленікі Таня ведала, што на Беласточчыне пражывае сорак тысяч беларусаў, і што ёсць у нас Сакрат Яновіч. Разам з ёй (на свой кошт) прыехалі тры студэнты з Гродна.

— Найбольшая асалода ад стасункаў з сябрамі, — кажа Аляксей Грынчанка. — У нас, студэнтаў, аднолькавыя праблемы. Карысна і дасканаліць польскую мову. Бо сённяшнія беларуска-беластоцкія студэнты амаль усе польскамоўныя.

— Калі выходжу ў вёску і чую як усюды размаўляюць па-нашаму, — расхвалёўваецца Павел Адамскі (ксыва „Пхэла") — мяне ахоплівае радасць. Хоць Павел размаўляе з бацькамі на польскай мове, беларускую ведае з белліцэя. Цікавасць да роднай нарадзілася ў Варшаве, дзе зараз штудзіруе інфарматыку.

— Тады званю сябрам, каб паразмаўляць па-нашаму. Павел захоплены Кленікамі і суседнімі вёскамі.

— Вось, іду сабе вуліцай і чую, што ўсе тут гавораць па-нашаму. Niesamowite!

Станіца ў Кленіках асаблівая не толькі з-за сяброў з Беларусі ды мовы. Лідэркай — Ілона Карпюк.

— Якія я бачу карысці для сваёй арганізацыі? — гадае ўголас Ілона: — Можа нехта запішацца ў БАС?

У Сацах

У сацоўскай станіцы сем чалавек — студэнты і ліцэісты.

Адам Кірылюк, студэнт гісторыі, прыехаў у вёску сваіх продкаў. У Сацах жывуць яго дзяды. Адам умее гаварыць па-нашаму (у яго мове вылучаецца англійскі акцэнт).

— Мяне палохае тое, што людзі так лёгка аддаюць сваю зямлю. Прадаюць гаспадарку, а самі едуць дажываць у горад. На іхныя месцы пасяляюцца цалкам чужыя людзі. Яны звычайна не падтрымоўваюць сувязей з вёскай. Гародзяць высокія платы, вешаюць табліцу *teren prywatny* або напускаюць злосных сабак. Кожны, хто зойдзе на панадворак можа пачуць „вон"! Нават той гаспадар, які прадаў ім хату.

Сёння, калі Адам з сябрамі пайшлі запісваць успаміны старажылаў, ля іх спынілася машына. Прыехалі французы. Аказваецца, чужаземцы ўмеюць дацаніць прыгажосць нашай архітэктуры і прыроды.

— А мы пачынаем цаніць сваё толькі з перспектывы горада, — Адам ведае гэта па сабе, — на жаль, часта бывае ўжо запозна!

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Кася Салавянюк і Адам Кірылюк з жыхарамі Сацоў

У сацоўскай станіцы вядуцца гістарычна-этнаграфічныя заняткі. Лідэрам тут настаўнік гісторыі Яўген Янчук.

— Я апынулася тут дзякуючы пану Янчуку, — кажа гайнаўская ліцэістка Кася Салавянюк. На летніку падабаецца ёй вясковая цішыня і прырода. Ну, і, вядома, знаёмства з жывой гісторыяй.

паміж самой моладдзю. Запрашаем сутваральнікаў нашай культуры, аўтарытэтаў. Вось, сёння мы плануем спатканне з паэтам Янам Чыквіным у Дубічах-Царкоўных, у Сацах ужо сустрэліся з Віктарам Стахвюком. З дакладамі выступіў гісторык Алег Латышонак.

Першыя маладзёвыя станіцы праходзілі з 9 па 14 жніўня г.г., і прынялі ў іх удзел за сорак студэнтаў, ліцэістаў і гімназістаў. Апрача пералічаных мясцовасцей моладзь гасцявала ў Дубічах-Царкоўных (лідэры: Міхась Сцепанюк і Павел Плева) ды ў Орлі (Аня Фіёнік і Ігар Іванюк).

На канец усе ўдзельнікі сустрэнуцца ў Чыжах...

— Бо там прывіталі нас з адкрытымі рукамі, — успамінае Ілона Карпюк: — Як добра, казалі, што нешта ў нас робіце!

Ганна Кандрацюк

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

У Сацах

Будаваць сувязі

Беларускія маладзёвыя станіцы — праект трох арганізацый: Беларускага форуму самакіравання, Беларускага аб'яднання студэнтаў і Звязу беларускай моладзі.

— Хочам у нашай моладзі выклікаць зацікаўленне гэтай тэрыторыяй, — кажа старшыня Форуму Міхась Андрасюк — нашай мовай і культурай. Хочам будаваць сувязі паміж пакаленнямі. Ды і не толькі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

У Кленіках

У бельскім ліцэі

У бельскі Агульнаадукацыйны ліцэй імя Браніслава Тарашкевіча, як паінфармаваў мяне ягоны дырэктар Андрэй Сцепанюк, прынята сёлета ў першыя класы 156 вучняў, у большасці дзяўчат; з гэтага ліку будзе скамплектавана пяць першых класаў. Найбольш, 74 асобы, гэта амаль палова новых вучняў, прыходзіць з Гімназіі н-р 3. Паступаюць і выпускнікі іншых бельскіх (н-р 1 і 2) ды навакольных гімназій: з Чаромхі, Кляшчэляў, Орлі, Ягуштова, Чыжоў, Боцькаў, а нават адна дзяўчына з Гайнаўкі.

У перыяд летніх канікул у ліцэі праходзіць рамонт. Адноўлена падлогу ў гімнастычнай зале, пакладзена керамічныя пліткі на ніжнім калідоры. Патрэбы ёсць намнога большыя, але, на жаль, не хапае сродкаў на іх рэалізацыю.

Ад выпускнікоў ліцэй збірае весткі пра іх далейшы лёс. Весткі гэтыя задавальняючыя: выпускнікі, што выбралі моцныя напрамкі, апынуліся там у ліку студэнтаў. Кіраўніцтву ліцэя гэтыя весткі патрэбныя і дзеля таго, каб належным чынам дастасоўваць асветны працэс да патрабаванняў далейшай адукацыі. Гэта не толькі павышае фармальны рэйтынг школы, але і з'яўляецца сведчаннем паспяховасці навучання, калі час праведзены ў сценах ліцэя добра скарыстаны для дасягнення той сталасці, якой запатрабуюць выклікі далейшага жыцця.

(ав)

Нараўчанскае Таварыства

Таварыства прыяцеляў Нараўчанскай зямлі (ТПНЗ) заснавалі напрыканцы 2002 года. Зараз да ТПНЗ належаць не толькі жыхары Нараўчанскай гміны, але і выхадцы ў Беласток, Гайнаўку, Варшаву, Лодзь і Люблін, а нават у далёкую Канаду. Старшыня Таварыства Вольга Зданоўская-Місяюк (яна ўраджэнка Нараўкі, але пражывае і працуе ў Беластоку) апрацавала і рэалізуе супольна з членамі праўлення багатую праграму дзейнасці ў карысць малой айчыны. Ладзіла дзве сяброўскія сустрэчы — два летнія балы прыяцеляў Нараўчанскай зямлі, дэманстрацыю найлепшых кінафільмаў памерлай Тамары Саланевіч (яна жыла і вучылася ў Нараўцы), а таксама сёлетнюю папленэровую выставу прац жывапісцаў-прафесіяналаў з Беластока і Варшавы ў пасляшкольным старым драўляным будынку з 1905 года ў Нараўцы. З часам зоймецца выдавецкай дзейнасцю (публікацыяй мясцовых легенд і паданняў).

ТПНЗ прымае ў свае рады новых членаў, творчых людзей, актывістаў. З гэтым трэба звяртацца да членаў праўлення Алімпіі Павільч (працуе яна ў нараўчанскім Гмінным асяродку здароўя) і Анны Стульгіс (дырэктар Гміннага асяродка культуры ў Нараўцы).

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

На „Басовішча”

Фота ІРЭНЫ СТЭЛЬМАШУК

Дух пушчы

Сталася тое ў ваколіцы, дзе пушча Лядская сутыкаецца з Белавежскаю пушчаю.

Аднойчы старажытным гасцінцам, што злучае Нараўку з Нарваю, вярталася з кірмашу грамада гаспадароў. Торг у Нараўцы выдаўся ненайгоршы: тое-сёе прадалі, што-нішто прыкупілі, ну і, вядома, карчму таксама не абмінулі. Таму весялосць то лёгкімі жарцінкамі, то дабрадушнымі кепікамі з фурманкі на фурманку пераскоквала. А калі гасцінец у Лядскую пушчу заглыбіўся, хлопцы з такім запалам урэзалі родную песеньку пра ўдалага малайца і яго вернага варанога каня, аж з елак кастрыца пасыпалася. Потым другую, трэцюю — не злічыць жа ўсіх песень, якія ў вясёлай грамадзе ў тых баках спяваюцца.

Вясёлы абоз да гушчавіны пры Бярнацкім Мосце якраз пад'язджаў, калі людзі звочылі, што якісьці пеўнік каля конскіх ног круціцца. Як на яго ні кышкалі, як з бічоў ні стралялі, але аніяк ад вазоў адагнаць не маглі.

Адзін з забаўнікаў і кажа:

— Відаць, нехта па дарозе на кірмаш згубіў птушку. Што ж, згаладнела ў лесе дык да людзей ціснецца.

Саскочыў ён з фурманкі і давай лавіць пеўніка. Вось-вось птушка амаль у руках, а ён аніяк схапіць яе не можа.

— Ну і нэдарэка! — насміхаліся з яго.

Самыя зухаватыя саскочылі з фурманак і таксама ўзяліся лавіць пеўня. Але той, хаця ля самых рук круціцца, аднак схапіць не даецца і ўсё далей ды далей у глыб пушчы падаецца, а хлопцы за ім: „Ціп! Ціп! Ціп!” — клічуць. Тым часам птушка ў малады ельнік ускочыла. Тыя ж маладняк акружылі, а тут раптам з-пад елачак парася выскоквае! Задзіваваліся не на жарты хлопцы, але ж пабеглі за хіжай жывінкаю. Парася ім каля ног мільгае, але ў рукі не даецца. Не дапамагло нават ласкавае закліканне: „Куц! Куц! Куц!”. Свінчо ў сцірту галля ўбілася. Лаўцы забеглі яго спераду, а з-пад галін магутны зубр падымаецца!.. Ад яго выгляду ўсім зухам у горле перасохла ды ногі ў зямлю паўрасталі. А тут зубр чмыхнуў, капытам зямлю грабнуў, пагрозліва голаў апусціў і на знямелых жартаўнікоў рушыў. Вядома, з іх усю адвагу быццам вецер здзьмухнуў: заверашчалі яны нямымі галасамі ды паскакалі, быццам зайцы, да дрэваў.

Як здолелі высока ўскараскаліся ды ў крык:

— Ратуйце! Зубр! Зубр напаў!..

Але ўжо не было каму іх ратаваць. На гасцінцы стала пуста, бо коні, нюхам пачуўшы звера, захраплі, ударылі ў хамуты і віхрам панесліся па гасцінцы. Тыя ж, хто на фурманках сядзеў, з усяе моцы ўхапіліся абедзвюма рукамі за за кланіцы ды драбіны, каб іх з фураў не вытрасла, калі калёсы свой шалёны танец на карэннях ды калдобінах танцавалі. Коні толькі ў чыстым полі, далёка за пушчаю, спыніліся.

Вось і сядзелі тыя малайцы на дрэвах, быццам вароны, ды на зубра з жахам пазіралі. А звер адыходзіць нават і не думаў: то капытамі дрэвы падкопваў, то лобам вываліць з карэннем іх спрабаваў. А калі на пушчу апусціўся змрок, стаў ён сабе воддаль у маладняку і пільна за седзячымі на дрэвах сачыў. Тыя ж рознымі спосабамі адганяць яго спрабавалі: шышкамі ды галінамі шпурлялі, крэсівам снапы іскраў дабывалі, але ўсё дарма — зубр стаў як укопаны. Так вось цалюсенькую ноч, быццам цецерукі, на дрэвах яны прасядзелі, а са страху ды холаду ніхто з іх і вока не сплюшчыў.

Толькі раніцай, калі ўжо цалкам развіднела, яны заўважылі, што ў ельніку зусім не зубр затаіўся, а вялікі вываранцень ляжыць!

Сёння ўжо цяжка дайсці, як тое было на самай справе і каму такое надарылася. Аднак старыя насельнікі тых ваколіц мяркуюць, што дзецюкі, празмерна свае горлы распусціўшы, самога духа пушчы ўгнявілі. І гэта ён такія кепікі з іх учыніў.

Мікола Гайдук

(Белавежскія быліцы і небыліцы)

Час рыцараў

Па рэчцы найхутчэй!

На сярэднявечныя падарожжы людзі трацілі вялікія грошы. Усюды трэба было плаціць: за пераезд зямлёю рыцара, за пераезд мастом, за паром, за ўезд у горад. Плату прымалі спецыяльныя чыноўнікі, якіх назначалі паны. За гэтыя грошы мелі рамантавацца дарогі і масты. Аднак часта, як гэта бывае ў жыцці, грошы ішлі зусім на іншыя справы, напрыклад, у кішэню рыцара.

У сярэдневякоўі не было шмат мастоў і іх уласнікі самі вызначалі аплату. Найчасцей той, да каго належаў мост, меў уладу ў горадзе або ў цэлым рэгіёне.

Самым папулярным і практычным камунікацыйным шляхам былі рэчкі. На судне не трэба было хваляваццa за начлег у карчме ці замку. Судны перавозілі цяжкія тавары: зерне, вугаль, соль, вялікія валуны для будоўлі замкаў і харомаў. Па рэчцы транспартавалі таксама бочкі з віном, сушанай рыбай або алеем.

Драўніны зусім не грузілі на судны. Пры драўніне працавалі арэлі, яны вязалі дылі ў вялікія „тратвы" і запускалі іх на ваду. Драўніна сама плыла да марскога порту.

Час падарожжаў па вадзе залежаў ад плыні рэчкі. Вядома, што найхутчэй пераплысці ўніз рэчкі, разам з хваляй. Таму часта будавалі судны ў адзін бок, яны звычайна не вярталіся пасля выпаўнення задачы. Прадавалі іх у порце на дровы. А людзі вярталіся дахаты пехатой.

(працяг будзе)

Зорка

Фота ЦЭЛІНЫ ГЛАГОЎСКАЙ

На канікулы на Крыт

Крыт — грэчаскі востраў на Міжземным моры, з якога пачатак бярэ еўрапейская цывілізацыя. Кухня там здаровая і смачная. У моры чыстая, празрыстая вада і сонца ад раніцы да вечара. А ноччу імпрэзы. Гэта і ёсць прычыны, дзеля якіх варта выбрацца туды на канікулы. Да гэтага ўсяго даходзяць яшчэ людзі. Яны мяне найбольш зацікавілі. І іхняя жыццярадаснасць. У Польшчы бачыш сумныя твары, стомленыя, без надзеі, на вуліцах шмат дрэсераў, паўсюдны страх перад іншым чалавекам. У Грэцыі — усмешкі, спрэчкі на вуліцах, гучныя размовы, радасць бачная ў вачах. На вуліцах стаяць скутэры з ключыкамі. Не крадуць. Калі шпацыруеш вуліцай, цябе зачапляюць: „Hello! Where are you from?.." Я ведаю, што я — турыст, ён — грэк, ды ведае, што на мне можа зарабіць, дык трэба яму быць сімпатычным у адносінах да турыста. Крыт — гэта быццам іншы свет, іншая планета. Цяжка гэта выказаць словамі. Можа так: абарончая асада ў польскім Біскупіне сягае 700 г. да нашай эры, а росквіт мінойскай культуры гэта 2000 г. да нашай эры. Няма тут параўнання. Гэта проста трэба пабачыць сваімі вачыма.

Цэліна Глагоўская, Гданьск

Фота ЦЭЛІНЫ ГЛАГОЎСКАЙ

Маё пакаленне

(песня гурту „Н.Р.М.")

Маё пакаленне
У цемры расло.
Цяпер яму цемра —
Таксама святло.

Маё пакаленне
Расло на мяжы
З заслонай жалезнай
У самай душы.

Маё пакаленне
Хаваецца ў цень,
У свет летуценняў,
Ва ўчорашні дзень.
Маё пакаленне
Гуляе і п'е,
Стаіць на каленях,
Не любіць сябе.

Набыць бы даляры,
Прадаць бы рублі,
А потым — падалей
Ад гэтай зямлі.
„Мы — вольные птицы,
Пора, брат. Пора" —
На стомленых крылах
У вырай ці рай.

Маё пакаленне
Сядзіць пры стале,
Сядзіць у турме
І сядзіць на ігле.
Сядзіць на пасадзе
І любіць стагнаць:
І трэба падняцца,
І цяжка стаяць.

Мы, беларусы, з братняю Руссю
Шукалі да шчасця дарог.
У бітвах за волю, у бітвах за долю
Нас гэты шлях перамог.
Нас аб'яднала, ні многа, ні мала, —
Удзел у дурной барацьбе.
Коласу слава, слава Купалу,
Але дзе месца тут для цябе?..

Згрызоты сумлення,
Пакуты душы...
Маё пакаленне —
Маё настальжы.
Твае сутарэнні,
Твае гаражы,
Спісаныя сцены,
Жыццё на мяжы.

Нібыта нядаўна,
Нібыта даўно.
Застыла кава,
Дапіта віно.
Маё пакаленне,
„Махая крылом,
Кровавую пищу
Клюёт под окном".

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Дэкламатары з Рыбалаў. Са школьнікамі апякункі: Лідзія Мартынюк (злева) і Іаланта Мордань

Польска-беларуская крыжаванка № 35

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.



Адказ на крыжаванку н-р 31: Шэпт, грак, асоба, мерапрыемства, расказ, ер, ар, адказ, ахвяра. Сера, горад, баск, шапка, раз, прыз, смех, рост, вар, Клара.

Анатоль Парэмбскі пачаў пісаць аб набалелым ды новым адразу, як паявілася беларуская „Ніва”...

Трошкі ён філосаф

— Трошкі ён філосаф, — усміхаецца жонка селяніна-паэта, Марыя. — Вершы пра чалавека ў сусвеце і звычайным тутэйшым жыцці. Пра Гарадок, пенсіянераў. Як гэта мець мужа — паэта? Вядома, гонар. І сынам таксама. Прыехаў наш найстарэйшы, што працуе электронікам у Холме, якраз на „Сяброўскай бяседзе” бацьку за верш узнагароду ўручалі. Усхваляваўся. Вершы на камп’ютэры перапісаў, каб хораша было.

Род Парэмбскіх (Парэмскіх) выводзіцца з ваколіц Гарадка — з Меляшкоў, Страшава. Адтуль Анатолевы бацькі выехалі ў Мастаўляны, пасля вярнуліся на роднае страшаўскае гняздо. Цяпер Парэмбскія жывуць у Валілах-Станцыі, зараз за Гарадком, вёска ўжо спалучылася з мястэчкам — вуліцай Беластоцкай. Тут і лес, і поле, і, вось, Лісяя вуліца, адразу ад Беластоцкай убок. Шырокая на 10 метраў, толькі адна хата выступае на шасці метрах, абгароджаная новым плотам. Парэмбскія пратэстуюць і пішуць, у „Гарадоцкія навіны”: павінна быць як належыць, і каб справядліва было, і хораша.

Анатоль Парэмбскі пачаў пісаць аб набалелым ды новым адразу, як паявілася беларуская „Ніва”. З’явіліся ягоныя допісы адразу ў першых нумарах, ад мастаўлянскіх вестак. А пісаў ад заўсёды, як памятае. Толькі ўсё пагінула. І вершы таксама. Высылаў ён іх, як вучань мастаўлянскай беларускай школы, у „Пионера Белоруссии”. Мелі быць надрукаваны ў тым нумары, які меў выйсці ў дзень, калі фашысцкая Германія напала на Савецкі Саюз. Дома была вялікая беларуская бібліятэка, фашысты яе спалілі. Цяпер вершы — польскія і беларускія — надрукаваў у „Гарадоцкіх навінах”, зазначыўшы, што не належыць ён да літаратуранай групы „Каласы”, якая яднае гарадоцкіх народных творцаў.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Марыя і Анатоль Парэмбскія

— Прыйдзе што ў галаву — дык і пішу. Запісваў жыццё, шкада, што гэтыя „дзённікі” развеяліся па свеце. Трэба запісанае збіраць да купкі. Цяпер ужо і часу больш...

Сустракаю Анатоля Парэмбскага і ягоную жонку Марыю на падворку — якраз уязджаюць на трактары з прычэпам — вяртаюцца з дачення кароў на лугах. Значыць, часу можа і шмат, але земляроб практычна ніколі не адпачывае. Хіба што пісанне — і патоля, і нейкі занятак. Варта, каб нашы людзі пісалі. Ды пасылалі весткі ў свае газеты, збіралі запісы пра былое, зазначалі сваю гісторыю. А шмат тут у нас і адукаваных людзей, каб пісалі аб нашай зямлі. І пра даваенны час таксама, і пра акупацыю. Вось, напрыклад, у „Ніву”, „Часопіс”. Праўда, рэдактары часам асцярожныя з крытыкай...

Вось, і прозвішчы. Ёсць роды жывучыя тут спрадвеку. Запісаць трэба, растлумачыць, след пакінуць, бо людзі забываюцца, уміраюць тыя, хто ведаў. Напрыклад, да Парэмбскіх далучана было прозвішча Чыгаюк. Яшчэ Антолеў дзед быў Чыгаюк-Парэмскі. Казалі, спецыяльна дадаў тое „Парэмбскі” ці „Парэмскі” меляшкоўскі пан, што называўся Радавіцкі, ці мо Радавіцька...

Парэмбскія — чытачы „Нівы” ад самога пачатку. Выпісваюць яе ў пісьманосца, раз у квартал. — Забудзем — прыпомніць, — заўважае Марыя.

— Трэба, каб хтосьці яе чытаў — на тое яна і выходзіць, — падтаквае Анатоль.

— Маем і ўсе нумары і „Гарадоцкіх навін”. Такія родныя газеты. Цяпер мы выйгралі падпіску на „Навіны”, зараз іду ў бібліятэку па новы нумар. Крыху аж неяк сорамна, быццам мы не маглі сабе самі купіць. Грош жа ж невялікі, але для рэдакцыі, тых, хто тое робіць — важная справа. То ж і „Ніва” каштуе няшмат. А нумары прыдаюцца. Напрыклад, пазычала ў нас падшыўку адна суседка, якое ўнучка піша дыпломную працу аб Гарадку. Вядома, да звароту. Сын наш, Мірык (а маем іх чатырох), перачытвае ўсе нумары, як прыедзе. А калі хтосьці з ваколіцы напіша, дык аж весялей на душы. Бо гэта самога цябе натхняе — тэма, штосьці цікавае, што цябе кранае, абходзіць...

Міра Лукша

Падумайма пра заўтра

Краіна вяковых няволяў
А так яе любіш чамусь
Бо тут мае шчасце і нядоля
Ты родная мне Беларусь.

Уніі колераў розных
Карысці табе не далі
Вырывалі ў цябе па кавалку
Твае радавітай зямлі.

Ворагі ўсялякіх адценняў
Не ўспелі цябе задушыць
Хочацца сёння мне толькі
Зямлі Беларускай служыць.

А продкам сваім непакорным
Удзячныя сэрцам, душой
За стварэнне ў няволі
Спадчыны мудрай такой.

Ад Еўфрасінні Полацкай
Да хрысціянскіх святынь
Да партызанскіх магілаў
Вялікай Айчыннай вайны.

А сёння пакіньма ўсе спрэчкі
Пагоня ці крыж, ці звязда
Уся беларусаў дыяспара:
Да працы для свайго дабра!

Анатоль Парэмбскі

Бутайла — душа неспакойная

Калі ка мне прыйшла вестка, што Янка Тарчэўскі развітаўся з белым светам, я палічыў неабходным напісаць пра гэта і ягонаму сябру, Рышарду Бутайлу. У адказ атрымаў ліст ад ягонай дачкі Ванды, у якім яна паведамляла, што Р. Бутайла памёр у красавіку 2003 года.

Значыць, што ўсё менш астаецца прадстаўнікоў ваеннага пакалення. „Апаражняем месца для тых, што на свет прыходзяць новыя” — так гэта пракаментавала спадарыня Ванда. Ды і сляды нашы астываюць паціхоньку. Калі што не запісанае, пра тое памяць знікае з пакаленнем. А Бутайла быў шматгадовым карэспандэнтам „Нівы”. Пісаў нават вершыкі... ды і чым ён не цікавіўся! „Вельмі любіў перапісвацца і думкамі абменьвацца ў лістах”, — піша ягоная дачка. У ліставанні карыстаўся ён нават мовай эсперанта. Меў сяброў у Аўстрыі, а нават і ў Японіі. Калі мы з ім пазнаёміліся (пісьмова — сустрэцца ніколі не давялося), то я яму пасылаў эсперанцкі слоўнік з Познаня. Бутайла быў актыўным чалавекам. У Свінавусці ўдзельнічаў у гуртках моладзі. Памятаю, калі была моднай беларуская песня „Вы шуміце, шуміце нада мною бярозы...”, ён рабіў пераклад яе тэксту на польскую мову і да мяне даслаў гэты тэкст „для кансультацыі”. Раз апрацаваў „алфавіт” для сляпых (карысталіся ім у Аўстрыі).

Быў паслужлівы. Гатоў кожнаму дапамагаць, хаця хварэць даводзілася яму часта, а і з дэпрэсіямі змагацца таксама, што з лістоў часценька далося адчуць.

Наша знаёмства пачалося з таго часу, як я наладзіў сувязі з Янкам Тарчэўскім. Зрэшты я на пачатку 1950-х гадоў сам працаваў у Свінавусці (потым ён мне дапамог сабраць паперы аб часе маёй там працы). У перапісцы карыстаўся ён кірыліцай або лацінкай. Апошнімі гадамі выключна польскай мовай. Ён сам, здаецца, быў з Польшчы, толькі, бадай, у час вайны жыў на Віленшчыне. Там належаў да польскай антынямецкай нейкай арганізацыі. Беларускую гісторыю ведаў добра. Раз мне даказваў, што пілот Жвірка, які згінуў у катастрофе з Вігурам, быў беларусам. Аднак да людзей, якія вырашылі жыць на Захадзе, ставіўся непрыхільна. І маіх з імі сувязей не ўхваляў. Раз выявіў, што ён — грамадзянін свету і мела гэта выгляд, быццам у яго былі нейкія сувязі з людзьмі, якія мелі падобныя да ягоных погляды. Якія? Адказу ён мне не даў. Бадай і пісаць мне ад таго часу перастаў.

Я не раз думаў, што адзінокімі людзі адчуваюць сябе не толькі бессямейныя. У бессямейных пажылых жыццё асабліва цяжкім бывае. Але нават і ў сям’і, асабліва мужчынам, цяжка дагаварыцца з маладым пакаленнем, якое распараджаецца здароўем, сілай, сучаснымі ведамі і ўмеласцю імі карыстацца. Аднак няздольнае яно зразумець, што перажывае стары чалавек, які мог бы яшчэ шмат, пры дапамозе свайго вопыту, здзейсніць — была б толькі разумная падтрымка... Але ж кожная эпоха будуе сваю рэчаіснасць...

Анатоль Маўчун

Дафінансаванні

Кожны год у Арлянскую Управу гміны паступаюць прашэнні дафінансавання ад розных несамаўрадавых арганізацый. Асабліва многа ўплывала іх раней, а цяпер па некалькі ў год. Арлянскае самакіраванне, якое змагаецца з недахопам грошай на свае патрэбы, не ў змозе задаволіць усіх хадайнікаў. Сёлета ў рамках ашчаднасці адмоўлена нават у супольнай з БГКТ арганізацыі фэсту, ды і летась такі фэст не адбыўся.

Паводле гміннага казначэя Аляўціны Іваноўскай, ва Управу паступілі сёлета тры прашэнні пра дафінансаванне і ўсе яны былі падтрыманы.

На адпачынак дзяцей, ладжаны фондам „Caritas” Драгічынскай дыяцэзіі прызначана трыста злотаў. Былі прызначаны сродкі на ўзнагароды арлянскім удзельнікам спартыўных спаборніцтваў, ладжаных Павятовым школьным спартыўным звязам. Дафінансавана таксама фатаграфічную выстаўку „Жанчыны свету”, аўтарства пакойнага ўжо ўраджэнца Орлі Мікалая Нестаровіча, якая будзе адкрыта ў верасні ў арлянскай школе.

Міхал Мінцэвіч

Душа мая размаўляе па-беларуску

Размова з Наталляй РУСЕЦКАЙ, паэткай, перакладчыцай, аўтаркай томіку вершаў „Два бяссонні"

— Нядаўна ў Мінску выйшаў Ваш першы томік паэзіі „Два бяссонні". Адкуль такая назва?

— Два бяссонні — гэта перш за ўсё тыя два бяссонні, якія перажываюць закаханыя, у расстанні. Ён жыве ў сваім бяссонні, яна — у сваім. Мае асабістыя бяссонні можна таксама разумець як бяссонне беларускае, і бяссонне польскае, паколькі ў зборнік увайшлі апроч маіх вершаў таксама пераклады з польскай паэзіі.

— Такім чынам, каханне і адзінота з'яўляюцца галоўнымі тэмамі Вашай творчасці?

— Калі чалавек кахае, ён не можа быць самотным. Адзінота ў маіх вершах пазбаўлена глыбокага трагізму, мне здаецца, што паміж радкамі заўважаецца аптымізм. Мой смутак асветлены промнем радасці. Пасля разлукі надыходзіць момант сустрэчы.

— Як нараджаюцца ў Вас вершы?

— Паэтычнае натхненне не заўсёды прыходзіць тады, калі на зямлю апускаецца ціхая зорная ноч. Часам натхненне прыходзіць, калі гатуеш абед, і тады падгараюць катлеты... Але мушу кідаць гатаванне і хапаць гэтую хвіліну натхнення, таму што яна міне і разам з ёю знікне верш, які трэба паспець занатаваць. Спрабую часам скласці верш спачатку ў галаве, цалкам яго запомніць, а потым занатаваць яго, калі час будзе. Гэта вельмі складана, бывае, губляюцца асобныя радкі і тады ўсё рассыпаецца.

— Прынята думаць, што сапраўдная паэзія з'яўляецца вынікам душэўных перажыванняў, хваляванняў...

— Гэта сапраўды так. Паэзія вырастае з перажывання, якога нельга выклікаць штучна. Ніколі невядома, на што душа адгукнецца. Бывае, вельмі моцнае перажыванне праходзіць недзе побач і, банальна кажучы, не закранае струнаў душы. А бывае, што зусім выпадковае, здавалася б, нязначнае здарэнне западае настолькі глыбока, што потым „выліваецца" ў цэлы шэраг вершаў. Ёсць таксама такія ўражанні, якія застаюцца невыяўленымі, непрамоўленымі.

— Што, на Ваш погляд, самае важнае ў паэзіі?

— Шчырасць. І прыгажосць. Беларускай паэзіі ў большай ступені, чым польскай, уласціва спеўнасць, меладычнасць верша. Калі твор непрыгожы, каструбаваты, пазбаўлены ўнутранай мелодыкі, то гэта ўжо не зусім паэзія.

— У Вашым томіку ёсць пераклады вершаў Е. Ліпскай, В. Шымборскай, Г. Пасвятоўскай. Гэта Вашы любімыя паэты?

— Адны з любімых. Самая любімая — Галіна Пасвятоўская. З паэтычнымі перакладамі адбываецца цікавая рэч. Чытаючы вершы іншых аўтараў, раптам заўважаеш, што нейкі настрой, нейкае перажыванне маё ўнутранае, нібы ў люстры адбіваецца ў вершы польскага паэта. І з такога адлюстравання нараджаецца пераклад.

— А над якімі перакладамі Вы цяпер працуеце?

— На даны момант я перакладаю п'есу Вітальда Гамбровіча „Івона, прынцэса бургундская" для Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы ў Мінску. У нас, на Беларусі, творчасць В. Гамбровіча амаль невядомая, гэта будзе яго першая тэатральная рэалізацыя, таму я адчуваю на сабе вялікую адказнасць, каб у перакладзе тэкст не стаўся горшым. А гамбровічаўскія творы — гэта не самы лёгкі матэрыял, яны аказваюць моцнае супраціўленне, вымагаюць сапраўды творчай працы. Асабліва цяжка перакладаюцца аўтарскія неалагізмы, да сэнсу якіх даходжу праз асацыяцыі польскіх чытачоў і гамбровічазнаўцаў, а таксама свае асабістыя, спрабую не дасло́ўна перакладаць, а „пераносіць" тэкст у іншую культурную сітуацыю.

— Скажыце, калі ласка, чаму на рускамоўнай Беларусі Вы пішаце па-беларуску?

— Дзіўна, што людзей цікавіць не тое, што пішаш, як пішаш, пра што, а менавіта чаму на беларускай мове... Але мне здаецца часам, што гэта не мы выбіраем мову, а мова выбірае нас. Кажуць таксама, што вершы піша не розум, а душа. Відаць, душа мая размаўляе па-беларуску. Гэтая мова ёй бліжэйшая, яна перадалася можа нейкім касмічным шляхам.

— Але ў адным Вашым вершы чытаем: „Я даўно належу да Любліна"...

— Гэта гісторыя. Гэта прыналежнасць не паводле нацыянальнай ідэнтыфікацыі, а паводле часавапрасторавага фактару. Калі я знаходжуся тут, у Любліне, ажывае гістарычная памяць, успаміны крыві, згадваецца тое, што было за сотні гадоў да нас і раптам робіцца блізкім, знаёмым мне.

— Але ніжэй чытаем: „Тут заўсёды свежыя булачкі / ў кожнай краме а шостай раніцы"... Можа гэтыя булачкі так Вас прыцягваюць?

— На шчасце, на Беларусі ўжо таксама можна купіць цёплыя булачкі раніцай. Толькі ў Мінску я жыву крыху далей ад крамы, таму пакуль бяжыш, булачкі паспяваюць астыць. Асабліва зімой, бо ў нас значна мацнейшыя маразы.

— Дзякую за размову.

Размаўляла Агнешка Баравец
(размова аўтарызаваная)

Два бяссонні

Тваё бяссонне — святло агарка,
смак моцнай кавы, пах недапалка,
яно твой госць, што чакае рання...
Маё бяссонне — з табой спатканне.

Твайму бяссонню прасторы мала,
яно аднойчы сусвет прарвала,
цяпер начамі яно блукае...
Маё бяссонне цябе чакае.

Тваё бяссонне цябе стамляе,
яно заўсёды прыгод шукае,
па стромых дахах нячутна ходзіць...
Маё бяссонне цябе бароніць.

Тваё бяссонне вярэдзіць сэрца,
яно ля свечкі не хоча грэцца
і шкло рукамі тваімі крышыць...
Маё бяссонне твой боль суцішыць.

* * *

Завітала ў душу разгубленасць:
ці не стане звычка залежнасцю?
Я даўно належу да Любліна,
да прытулку свайго замежнага.

Тут крывыя вузкія вулачкі
бягуць, нібыта спяшаюцца,
тут заўсёды свежыя булачкі
ў кожнай краме а шостай раніцы.

Тут дзіцячым малітвам Радзіка
усміхаецца Маці Боская,
тут зямля не чужая, наская —
Вялікае Княства Літоўскае.

***НАТАЛЛЯ РУСЕЦКАЯ** — нарадзілася ў 1974 г. Скончыла беларускае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага універсітэта. З'яўляецца стыпендыянткай праграмы Gaude Polonia міністра культуры Польшчы. Аўтарка вершаў і перакладаў В. Шымборскай, Г. Пасвятоўскай, Е. Ліпскай на беларускую мову.*

Польская паэзія па-беларуску

З самае раніцы патэлефанаваў мне прафесар Алег Лойка. Ён жыве ў Слоніме на Віленскай вуліцы, але час ад часу наведвае Мінск. Алег Антонавіч запрасіў да сябе з нагоды выхаду яго двухтомнай анталогіі польскай паэзіі XX стагоддзя „Напярэймы: ад Буга да Варты". Сядаю на „пяцёрку" і еду ў мікрараён Лабазоўка. Выходжу на Віленскай вуліцы і крочу да яго хаты.

Праз некалькі хвілін я ўжо сяджу з Алегам Лойкам на канапе і п'ю піва, трымаючы ў руках два тамы польскай паэзіі па-беларуску.

— А дзе вы так выдатна навучыліся польскай мове? — пытаюся ў земляка.

— Як дзе? — здзіўляецца прафесар. — Дома, у Слоніме.

— І ці моцная польская паэзія?

— О-о-о! Польская паэзія — самая моцная паэзія ў свеце! А на другім месцы — нашая, беларуская!

— А руская?

— У расійскіх паэтаў кволая і нецікавая паэзія. Яна ўся савецкая, — разважае Алег Лойка. — А калі і ёсць добрыя паэты ў Расіі, дык усе яны сваімі каранямі звязаныя з Беларуссю.

Прыйшлося з доктарам навук пагадзіцца, тым больш што, гартаючы двухтомнік ягоных перакладаў, трапіў на радкі майго любімага польскага паэта Тадэвуша Ружэвіча: „Паэт — гэта той, каторы адыходзіць, і той, каторы адысці не можа".

Такое грунтоўнае выданне польскай паэзіі XX стагоддзя па-беларуску выдаецца ў Беларусі ўпершыню. Упершыню ў Беларусі друкуецца большая частка з яе 180-і аўтараў, творчасць якіх ярка выявіла асаблівасці эстэтычных пошукаў польскай паэзіі мінулага стагоддзя. Пачынаючы ад найстарэйшага паэта XX стагоддзя Цыпрыяна Норвіда і знаёмячы беларускага чытача з самым маладым польскім паэтам Марцінам Галасем, перакладчык зрабіў вялікую літаратурна-перакладчыцкую працу. Тым больш што і сама польская паэзія гэтага стагоддзя даволі глабальная. Ды і якіх вялікіх паэтаў Польшчы загучалі творы па-беларуску! Тут і Яраслаў Івашкевіч, і Юльян Тувім, і Марыя Канапніцкая, і Чэслаў Мілаш, і Караль Вайтыла, і Віслава Шымборская. Ды і дзе іх усіх пералічыш! Ёсць тут і лаўрэаты Нобелеўскай прэміі. Вось такая яна, польская паэзія. Таму меў рацыю перакладчык Алег Лойка, калі сказаў, што паэзія нашых суседзяў самая моцная. І светлая, і глыбокая, як гэтыя радкі маладой паэткі Аліны Лясота:

Ёсць маладзік, каб людзі маглі марыць.
Ёсць сонца, каб дзень мог пачацца.
Ёсць каханне, каб свет ратаваць.

Сяргей Чыгрын

Хрэстаматыйныя вершы Віктара Шведа

У мінулым годзе ў Мінску ў выдавецтве „Вышэйшая школа" выйшла другое, перапрацаванае і дапоўненае, выданне хрэстаматыі „Беларуская дзіцячая літаратура". Складзена яна ў адпаведнасці з праграмай навучання і прызначана навучэнцам дашкольнага аддзялення педагагічных каледжаў і вучылішчаў. Сабраныя ў двух раздзелах („Вусная паэтычная творчасць" і „Беларуская дзіцячая літаратура") творы адлюстроўваюць працэс станаўлення, развіцця і сучасны стан нацыянальнага дзіцячага пісьменства.

У кнізе прадстаўлены творы 115 літаратараў, пачынаючы ад класікаў (Максім Багдановіч, Янка Купала, Якуб Колас) і канчаючы на сучасных творцах (Віктар Шніп, Вольга Іпатава, Галіна Каржанеўская). У іх ліку апынуўся таксама Віктар Швед. Складальнікі хрэстаматыі (Маргарыта Яфімава і Вікторыя Ляшук) пішуць, што паэт-„белавежац" у сваёй творчасці „тонка ўлічвае псіхалагічныя асаблівасці дзяцей, непасрэднасць, багатую фантазію, іх імкненне да пазнання навакольнага, да гульняў і забаў. Далучае дзяцей да беларускага слова, выхоўвае ў іх дабрыню, чалавечнасць, спагаду". Падборку з адзінаццаці вершаў, адкрывае вядомы твор „Я нарадзіўся беларусам". **(вл)**

Дзякуючы сучаснай тэхніцы атрымліваць ці ўдасканальваць сваю адукацыю цяпер можна і не выходзячы з дому альбо з бліжэйшай Інтэрнэт-кавярні...

http://baj.ru/belkalehium

Вось і скончылася лета. Для кагосьці яно запомнілася сёлетняй незвычайнай халадэчай і дажджамі, а для кагосьці прыемнай вандроўкай у цікавыя мясціны. Але хочаш — не хочаш надыходзіць восень, а разам з ёй і патрэба для многіх сесці на вучнёўскія ці студэнцкія лаўкі. Дзякуючы сучаснай тэхніцы атрымліваць ці ўдасканальваць сваю адукацыю цяпер можна і не выходзячы з дому альбо з бліжэйшай Інтэрнэт-кавярні. Бо „сусветнае павуцінне" дае магчымасць вучыцца нават толькі адкрыўшы той ці іншы сайт. Адным з іх з'яўляецца „Беларускі Калегіюм".

Калі карыстальнік набярэ адрас http://baj.ru/belkalehium, то перад ягонымі вачыма адкрыецца даволі цікавае выяўленне розных друкаваных тэкстаў. Толькі ўверсе пасярэдзіне можна ўбачыць эмблему-назву сайта. Больш ніякіх малюнкаў альбо карцінак на сайце няма. Такая галоўная старонка адразу ўказвае на яго вялікую сур'ёзнасць.

Як сцвярджаюць стваральнікі, „Беларускі Калегіюм аб'ядноўвае навукоўцаў, журналістаў, людзей мастацтва культуры, грамадскіх асобаў з мэтай актуалізацыі шматкультурнай беларускай традыцыі спрыяння дэмакратычным пераўтварэнням у беларускім грамадстве ў кантэксце вызначальных каштоўнасцей еўрапейскай цывілізацыі і агульнаеўрапейскіх працэсаў інтэграцыі". Але для нас падаецца цікавым тое, што „Калегіюм" прапануе дадатковае навучанне, якое ў ім бясплатнае.

З левага боку галоўнай старонкі на шэрым фоне выявы месцяцца рубрыкі сайта. Сярод іх — выйсце на яго англамоўную версію, лекцыі па гуманітарных прадметах, студэнцкія праекты, кнігі і аналітыка, таксама ёсць магчымасць скантактавацца з аўтарамі. На жаль, у рубрыцы „Навучальныя праграмы" мы маем магчымасць пазнаёміцца толькі з навучальнай праграмай па спецыяльнасці „Журналістыка", па астатніх спецыяльнасцях — пустата.

Але ў многім такую недарэчнасць кампенсуе наступная рубрыка „Лекцыі", дзе размешчана вялікая колькасць лекцый выкладчыкаў „Калегіюма". Для студэнтаў-гуманітарыяў, а таксама для ўсіх, каго цікавяць сучасныя веды ў гэтых галінах, вельмі карысна будзе пазнаёміцца са зместам гэтых лекцый. Узгадаю толькі некаторыя іх назвы „Журналісцкая этыка", „Грамадскія сувязі" (public relations), „Мастацтва таталітарызму", „Сучасны псіхааналіз" і многае-многае іншае.

У рубрыцы „Студэнцкія праекты" карыстальнік мае магчымасць пазнаёміцца з разнастайнымі студэнцкімі выданнямі і даследаваннямі. Так, напрыклад, у падрубрыцы „Залатыя дыскі беларускага рок-н-рола" можна даведацца пра гісторыю развіцця і дзейнасці амаль усіх найбольш вядомых беларускіх рок-гуртоў.

Не меншую цікаўнасць выклікае і наступная рубрыка „Кнігі", дзе размешчаны выяўленні выданняў на грамадствазнаўчую тэматыку.

Наступная рубрыка невялікая па змесце і ўтрымлівае толькі адзін артыкул „Стратэгія дзейнасьці НДА і недзяржаўных мэдыяў у Беларусі", які, тым не менш, вельмі змястоўна і ў той жа час дэтальна раскрывае спосабы і варункі дзейнасці няўрадавай беларускай прэсы ў сучасных палітычных умовах.

Правы бок галоўнай старонкі ёсць свайго роду навінным раздзелам сайта. У ім падаюцца звесткі пра апошнія абнаўленні, якія, на жаль, адбываюцца не вельмі часта. Тым не менш, маем магчымасць пазнаёміцца з новымі размешчанымі на сайце тэкстамі лекцый і студэнцкіх праектаў.

Уладзімір Лапцэвіч

Быў абвешчаны сацыялістычны спабор спартоўцаў і хлебаробаў. Але ўжо першыя дні алімпіяды вярнулі фанабэрнікаў і летуценнікаў на грэшную зямлю...

Беларусь, беларусы...

Ілюзіі і рэальнасць

Калі прэзідэнт беларускага Нацыянальнага алімпійскага камітэта дэкларавaў паход у Афіны „па залатое руно" (заданне — ажно 25 медалёў!), некаторыя напэўна паверылі, што ўзнагароды для беларусаў пасыплюцца як спелыя зярняткі ў бункер. Тым больш быў абвешчаны сацыялістычны спабор спартоўцаў і хлебаробаў. Але ўжо першыя дні алімпіяды вярнулі фанабэрнікаў і летуценнікаў на грэшную зямлю. Паводле выпускаў навін беларускай тэлевізіі можна канстатаваць, што жнеяры ўпэўнена наперадзе — папершае, супернікаў у іх няма, калі не лічыць палявых мышэй, па-другое, на допінг ніхто не правярае. Што датычыць „няўдалага" выступу спартоўцаў, то нічога надзвычайнага не здарылася. Алімпійнікі ж не камбайны, а жывыя людзі. А залатая ліхаманка ў любой сферы дабром ніколі не сканчалася. Вось і на гэтай алімпіядзе. Заявілі расіяне, што здабудуць ажно трыццаць залатых медалёў, а зараз ламаюць галаву, як бы апярэдзіць па гэтым паказчыку хаця б украінцаў. А кітайцы нічога не крычалі, а рэальна спрачаюцца з амерыканцамі за агульнае першынство.

Беларусы выступаюць па-рознаму. Прыкладам, шабліст Дзмітры Лапкес заняў чацвёртае месца. Гэта лепшы вынік за час суверэннага фехтавання. Лапкес адолеў двухразовага алімпійскага чэмпіёна расіяніна Станіслава Пазднякова. І хоць далей мінчаніну забракла псіхалагічнай раўнавагі, пахваліць яго варта. Цікава, што ў паўфінале Лапкеса перамог італьянец Альда Мантана — вучань... беларуса, чатырохразовага алімпійскага чэмпіёна Віктара Сідзяка.

На жаль, не спраўдзіла надзеі ў плаванні Алена Попчанка. Лепшым яе вынікам стала сёмае месца на дыстацыі 100 метраў батэрфляем. Канкурэнцыя ў плаванні была надзвычай жорсткай і перамагалі тыя, хто здолеў выйсці на пік формы. Расчаравалі нашыя штурхальнікі ядра, якія сур'ёзна разлічвалі на медалі. Чэмпіён свету Андрэй Міхневіч нават не склаў канкурэнцыі прызёрам і стаў толькі пятым. На чацвёртай пазіцыі спынілася Надзея Астапчук, якая стала мацнейшай у кваліфікацыі, а пасля гэтага „зламалася". І ўжо зусім далёкімі ад п'едэстала былі айчынныя стралкі, якія рэгулярна заваёўвалі медалі на папярэдніх алімпіядах.

Найбольш паспяхова ў першы тыдзень выступалі беларускія цяжкаатлеты, якія дасягнулі вышэйшых вынікаў у суверэннай гісторыі. Пінская дзяўчына Ганна Бацюшка здабыла срэбра ў катэгорыі да 63 кг, пры тым усталяваўшы сусветны рэкорд у рыўку. Кампанію ёй у гэтай жа катэгорыі склала віцяблянка Таццяна Стукалава, якой дасталася бронза. Бацюшка саступіла першае месца ўкраінцы толькі па прычыне большай сваёй вагі. З-за гэтага ж за рысай прызёраў апынуўся магілёвец Віталь Дзербянёў, за якога асабліва крыўдна.

Ну а першы залаты медаль для Беларусі заваяваў дзюдаіст, ураджэнец Цвярской вобласці Ігар Макараў. У катэгорыі да 100 кг у фінале ён адолеў карэйскага барца. Золата Макарава, які раней быў самбістам, стала першым у гісторыі беларускага алімпійскага дзюдо.

Пасля першых шасці дзён гульняў па медалях беларусы былі ў канцы дваццаткі лепшых краін, паводле неафіцыйнага заліку займалі 15-е месца. Так што ніякой „зорнасці" і ніякога правалу. У адпаведнасці з рэальнасцю мы на сваіх звыклых пазіцыях.

(ух)

Занатоўкі кантрабандыста

Рэкламная драма

Можаце смела плюнуць у вочы таму, хто скажа, што першымі сталі карыстацца рэкламай у былых сацыялістычных краінах банкіры, бізнесоўцы ці палітыкі. Я сцвярджаю, што першымі былі кантрабандысты. Ды нават ведаю імя гэтага чалавека. Першым быў беластоцкі беларус Алік Гартанюк.

У той час, калі заходнееўрапейскі тэлеглядач выў ваўком ад рэкламнага гвалту на яго любімых тэлевізійных каналах, грамадзяне сацыялістычных краін марылі хоць адным вокам убачыць што гэта такое. Рэклама для іх была нечым незразумелым, нязведаным і магічным. Уцяміць грамадзяніну, які нічога не можа знайсці ў краме, для чаго прыдуманая капіталістамі прапаганда іх прадукцыі, было практычна немажліва. Але кемлівыя беларусы, як толькі пазнаёміліся з гэтай з'явай, адразу зразумелі, што справа перспектыўная.

— Каб пайшлі большыя прыбыткі, — гаворыць мне неяк наранку Алік, прыклаўшы да скроняў кавалкі лёду, — трэба даць рэкламу нашаму тавару.

Няшчасны Алік! Ён так моршчыў лоб і сціскаў зубы ад пакутаў пасля ўчарашняй замочкі няўдалай спробы прадаць тавар, што яго пашкадавала нават жонка. Яна купіла яму піва. Гэта было вельмі дарэчы, бо кожная спроба нешта сказаць выклікала жудасны боль у Алікавай галаве. І было вельмі нечакана. Ягоная жонка ўвесь час перажывала, што яе муж жыве вельмі весела і заўсёды шукала нагоду, каб гэтае жыццё трошкі папсаваць.

Я пачакаў пакуль ён дап'е піва і ўключыўся ў размову:

— Хіба звар'яцеў? Ты яшчэ на ілбе напішы, што кантрабандыст і гандлюеш нелегальным алкаголем ды цыгарэтамі. У нашай справе трэба сядзець ціха і не падымаць непатрэбнага пылу. Ці хочаш, каб кожны паліцыянт цябе ў твар ведаў?

— А то не ведаюць?! — не пагадзіўся Гартанюк. — Нас не толькі паліцыянты, але нават сабакі ўсёй Беласточчыны пазнаюць. Ваўкоў баяцца — у лес не хадзіць. Лепш не пляці дурноты, а паслухай што я надумаў.

І распавёў мне пра свае планы:

— Мы ўвесь час хаваемся ад паліцыі, таму нашы кліенты не заўсёды нас знаходзяць. А на беластоцкім рынку ёсць паляк, які робіць фотаздымкі. Трэба яго ўпрасіць, каб сфатаграфаваў наш тавар і павесіў фота ў сваім атэльле. Людзі будуць звяртаць увагу, пытацца, а ён ім гаварыць, дзе нас знайсці. Нам застанецца толькі сядзець у ціхім месцы і піва папіваць. Кліенты самі нас знойдуць. А фатографу за гэта ў канцы дня нальем шклянку.

— Не будзе ён з намі звязвацца за шклянку, — запярэчыў я. — А большых выдаткаў мы не пацягнем.

— Не ведаеш ты палякаў, — буркнуў Гартанюк. — Для паляка-гандляра дармовая шклянка, што для камуніста сусветная рэвалюцыя. Менш трапайся і скарыстаем з мажлівасцей рэкламы.

Ён не памыліўся. Фатограф з радасцю прыняў нашу прапанову. І ўжо назаўтра мы чакалі вынікаў рэкламнай кампаніі, седзячы недалёка ад фотаатэльле і папіваючы халоднае беластоцкае піва. Доўга чакаць не давялося. Кліентаў з'явілася адразу ажно пяць. Былі яны адзетыя ў паліцэйскія мундзіры і прыехалі на паліцэйскай машыне. Тавар купілі адразу ўвесь. Праўда забыліся заплаціць. І з намі не цырымоніліся. Закінулі як дровы ў паліцэйскую машыну, завезлі ў пастарунак і выпісалі кару. Дзесьці ў пяць разоў большую, чым каштаваў увесь наш спірт. Ды гэта была не апошняя неспадзеўка. У пастарунку нас яшчэ раз пазнаёмілі з фатографам. Бедалага плакаў, выціраючы рукавом смаркачы і нешта расказваў паліцыянтам пра вялікую колькасць дзяцей і цяжкое жыццё чалавека мастацтва. Яго таксама аштрафавалі за дапамогу ў продажы неакцызнага алкаголю. Добра што ліцэнзію на фотасправы не забралі. Дапамагла значная колькасць галодных дзяцей.

— Ну што, — пытаюся ў Аліка, як нас выпусцілі з пастарунку, — дапамагла нам рэклама?

— Халера яе бяры, — адказвае ў роспачы Гартанюк. — Але ж на памылках вучацца. Будзем працаваць па-старому, як нашы дзяды і прадзеды. Ды і сапраўды добры тавар, як у нас, рэкламы не патрабуе.

— Шкада толькі што гэта да цябе позна дайшло, — усміхнуўся я, і мы пайшлі па бурлівай беластоцкай вуліцы дахаты, мінаючы рэкламныя шчыты, якія тады ў Беластоку яшчэ толькі-толькі пачыналі ўсталёўваць банкіры і бізнесоўцы.

Сымон Нальшанскі

САЦЫЯЛЬНАЯ ДАПАМОГА Ў ОРЛІ

Роля сацыяльнай дапамогі ў мясцовым асяроддзі расце. Гмінныя асяродкі сацыяльнай дапамогі атрымалі ў гэтым годзе дадатковую нагрузку. У краіне назіраецца з'ява, што калі грамадства багацее, расце і лік людзей патрабуючых падтрымкі і непасрэднай апекі. У Арлянскай гміне многія асобы і сем'і карыстаюцца сацыяльнай дапамогай, але не ўсім хапае грошай.

Як паведаміла мне Марта Сушч, загадчыца Гміннага асяродка сацыяльнай дапамогі ў Орлі, сёлета ў першым паўгоддзі падтрымку атрымалі 418 асоб са 120 сем'яў. У рамках даверaных задач дапамогу атрымала 206 чалавек з 68 сем'яў, а з бюджэту гміны 318 асоб з 80 сем'яў.

Бюджэт дзяржавы выдзеліў пастаянны засілак двум асобам, пастаянны кампенсацыйны васемнаццаці, гарантаваны перыядычны адной, перыядычны сарака сямі і перыядычны мацярынскі чатыром; дванаццаці дзецям былі прызначаны грошы на аплату падручнікаў для першага класа пачатковай школы.

З гміннага бюджэту мэтавы засілак на куплю адзення, апалу, харчоў і т.п. атрымалі 38 асоб і спецыяльны мэтавы засілак пяць асоб, якія задавальнялі крытэрый для карыстання дапамогай; дзевяноста васьмі дзецям было аплачана харчаванне ў школьнай сталовай.

З першага мая паступаюць новыя заяўкі на сямейныя засілкі; у ліпені гэтай формай дапамогі карысталася 68 сем'яў. Падтрымкай на мацярынскую апеку ў перыяд выхаваўчага водпуску карыстаецца чатыры сям'і. На дадатак адзінокім выхаваўцам дзяцей мае права 23 асобы. Падтрымку на адукацыю і рэабілітацыю інвалідных дзяцей атрымліваюць дзве сям'і на двое дзяцей. Дадатак на навучанне дзяцей па-за месцам жыхарства назначаны васемнаццаці дзецям з пятнаццаці сем'яў. Апякунчым засілкам карыстаецца сем асоб, а апякунчымі пастаўкамі дзве.

Асяродак змагаецца не толькі з недастатковай колькасцю грашовых сродкаў на патрэбы патрабуючым, але часта і з нетэрміновым іх прытокам, таму некаторыя падапечныя атрымліваюць іх з месячным а нават большым спазненнем.

Міхал Мінцэвіч

Генеральнае консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку інфармуе грамадзян Рэспублікі Беларусь часова і стала пражываючых у Падляшскім і Вармінска-Мазурскім ваяводствах, што ў сувязі з выбарамі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, якія адбудуцца 17 кастрычніка 2004 года, арганізаваны выбарчы ўчастак па Беластоцкай консульскай акрузе (Падляшскае і Вармінска-Мазурскае ваяводства) па адрасу **Генеральнага консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку, вул. Электрычная, 9, 15-080 Беласток (ul. Elektryczna 9, 15-080 Białystok).**

Адначасова паведамляем, што ў адпаведнасці з арт. 4 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь, выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў з'яўляюцца ўсеагульнымі: права выбіраць маюць **грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту**.

Дадатковую інфармацыю па пытаннях выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь можна атрымаць у Генеральным консульстве Рэспублікі Беларусь у Беластоку ва ўсе працоўныя дні ад 9^{00} да 12^{00} і ад 13^{00} да 16^{00}, таксама па тэл. (085) 664 99 40.

Патрэбны ў цэнтры

Многа гадоў у Гайнаўцы аўтобусны вакзал ПКС быў у цэнтры горада. Пару гадоў таму яго перанеслі ў будынак чыгуначнага вакзала. І стала не так зручна, як было раней. Цяпер бяжы на той вакзал у тупіку (тут канец вул. Дварцовай) і адтуль ужо на аўтобусе ПКС едзеш назад. Адлегласць будзе сама менш у 500 метраў.

Зараз толькі што ў цэнтры горада ліквідавалі нядзеючы чыгуначны пуць. Ёсць свабоднае месца на прыпынак аўтобусаў ПКС. Для пасажыраў была б вялікая выгада.

Што на гэтую прапанову гарадскі самаўрад і бурмістр Гайнаўкі?

(мох)

Запрашэнне на паказ

27 жніўня ў 16 гадзін у Гайнаўцы па вул. Фабрыка хімічная, 14, распачнецца паказ крыцця даху сучаснымі стрэхавымі матэрыяламі. На месцы будзе можна купіць матэрыялы для пакрыцця даху з 5% скідкай.

Арганізатар — прадстаўнік фірмы „Трафік" — запрашае на пачастунак кілбаскамі ды півам пры адборнай музыцы. Апрача ўсяго гэтага можна будзе выйграць 14-цалёвы тэлевізар.

(мох)

Вялікае беспрацоўе ў нашым рэгіёне давяло да сітуацыі, што амаль кожны з нас мае сярод сваіх сямейнікаў ці знаёмых асоб, якія шукаюць працу. Каб неяк памагчы такім людзям, вядзем рубрыку „Дапамагаем з «Нівай»". Побач бясплатна будзем змяшчаць аб'явы людзей, якія шукаюць працу або могуць даць працу. Сардэчна запрашаем усіх чытачоў дасылаць у рэдакцыю свае прапановы. Рубрыку вядзе Паўліна Шафран-Асташэвіч, з якой можна кантактавацца па мабільніку нумар 0600 635 425 (або ў рэдакцыі па панядзелках ад 10 да 12 — тэл. 743 50 22).

ДАМ ПРАЦУ

• Маладому цырульніку з вопытам, тэл. 0 606 994 639.

• Гандлёваму прадстаўніку з вопытам, вышэйшай эканамічнай адукацыяй, без дрэнных схільнасцей, з вадзіцельскімі правамі, на тэрыторыі Падляшскага ваяводства, тэл. 0 506 798 283.

ШУКАЮ ПРАЦУ

• Маладая жанчына, правы кат. В, добрае веданне рускай і англійскай моў, аператыўная, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 692 660 704.

• Краўчыха з вопытам шукае працу ў Бельску, тэл. 0 502 370 486.

• Жанчына, 47 гадоў, танна і дакладна прыбярэ бюро, кватэру, тэл. 676 17 64.

• Малады мужчына, сярэдняя эканамічная адукацыя, шукае працу ў Бельску, тэл. 0 505 568 234.

• Жанчына, 27 гадоў, вышэйшая эканамічная адукацыя, правы кат. В, кніжка здароўя, фіскальная каса (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 506 489 040.

• Жанчына, шукае працу ў Беластоку, двухгадовы стаж працы ў магазіне, добрае веданне рускай і англійскай моў, абслуга камп'ютэра (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 692 687 442.

• Малады інфарматык, 26 гадоў, працавіты і сумленны, правы кат. В, добрае веданне англійскай мовы, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 888 899 877.

• Абітурыентка рускай філалогіі шукае працу ў Беластоку, правы кат. В, добрае веданне англійскай мовы, закончаныя камп'ютэрныя курсы (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 732 60 27.

• Механік з вопытам пільна шукае працу ў Бельску, тэл. 0 692 438 475.

• Студэнтка пятага курса педагогікі заапякуецца старэйшай асобай, тэл. 0 602 322 407.

• Аператыўны мужчына шукае працу ў Беластоку, падставовае веданне нямецкай і рускай моў, абслуга камп'ютэра, правы кат. В, тэл. 0 608 210 435.

• Студэнтка, 22 гады, заапякуецца малым дзіцём у Беластоку, тэл. 0 507 189 841.

• Мужчына, 34 гады, кніжка здароўя, санітарны мінімум, правы кат. В, С, шукае працу ў Бельску, тэл. 0 505 675 556.

• Маладая жанчына, вышэйшая адукацыя (маркетынг), шукае працу ў Беластоку або ў Бельску-Падляшскім, правы кат. В, абслуга камп'ютэра, тэл. 0 602 769 109.

• Аператыўны мужчына, 29 гадоў, шукае працу ў Беластоку, падставовае веданне нямецкай і рускай моў, абслуга камп'ютэра, правы кат. В, тэл. 0 600 602 489.

• Маладая жанчына, правы кат. В, добрае веданне рускай і англійскай моў, аператыўная, шукае працу ў Беластоку, тэл. 0 692 660 704.

• Мужчына, 35 гадоў, сярэдняя тэхнічная адукацыя, сумленны, шукае працу, тэл. 0 693 075 252.

• Студэнт шукае працу ў Беластоку, свая машына, вадзіцельскія правы кат. В, добрае веданне рускай мовы, абслуга камп'ютэра (інтым і сецевы маркетынг не прапаноўваць), тэл. 0 603 431 445.

• Мужчына, будаўнічыя правы, санітарны мінімум — кожная праца ў Беластоку, тэл. 711 83 49.

• Мужчына, 48 гадоў, пільна шукае працу ў Бельску, II група інваліднасці, тэл. 0 604 671 311.

• Жанчына, 37 гадоў, стаж працы ў гандлі, кніжка здароўя, тэл. 0 502 600 565.

• Маладая жанчына без дрэнных схільнасцей заапякуецца дзіцём, вопыт, тэл. 0 602 432 565.

Дапамагаем сабе ўзаемна

У Бельску: 720 20 06

• Сям'я патрабуе помачы ў выглядзе яды і гігіенічных сродкаў.

• Сям'я просіць дапамогі ў выглядзе старой мэблі і адзення для дзяцей ва ўзросце 7, 9, 12 гадоў.

• Сям'я з дзяцьмі ва ўзросце 4, 9, 12 гадоў будзе ўдзячна за любую помач.

У Беластоку: 732 01 86, 712 11 53

• Сям'я просіць дапамогі ў выглядзе адзення, пасцелі і яды.

• Старэйшае сужонства шукае асобу, якая бясплатна дапаможа ў хатніх працах.

• Сям'я патрабуе помачы ў выглядзе яды і гігіенічных сродкаў.

• Сям'я з дзяцьмі ва ўзросце 4, 9, 12 гадоў будзе ўдзячна за любую помач.

• Тры сям'і з Відава, што каля Бельска-Падляшскага, з ахвотай аддадуць зімовыя курткі, мужчынскія і жаночыя штаны, світэры і іншае нязнішчанае адзенне, тэл. 730 40 00.

• Аддам дзіцячае адзенне ў добрым стане, тэл. 745 44 84.

Сабрала Паўліна Шафран-Асташэвіч

Абвесткі

Гмінны цэнтр культуры ў Міхалове (вул. Беластоцкая, 19) запрашае ўсіх ахвотных ***навучыцца спяваць.*** *Рэпетыцыі вядзе Аляксандр Алексяюк па панядзелках і пятніцах з 18 гадзіны.* **(мох)**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 053 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2004 r. upływa 5 września 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,45 zł, a kwartalnie — 44,85 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

„Даўціпы"
Андрэя Гаўрылюка

— Учора бачыла я, як краўчыха мерала Мірку ў поясе.

— І што?

— Ну, падумаць, што дуб патрабуе аж трохсот гадоў каб дасцігнуць такога абхвату.

* * *

Амерыканец выбраўся ў сваю першую экскурсію па Ірландыі. Калі заблудзіў, спытаў напатканага ірландца, як далёка да найбліжэйшага горада.

— Будзе яшчэ з палова мілі гэтай дарогай, — адказаў ірландзец, — і няхай вам Бог дадасць сілы.

Амерыканец прайшоў палову мілі, але горада не было. Спытаў пра горад чарговага ірландца і той адказаў яму таксама, што яшчэ палова мілі. Прайшоў гэту дыстанцыю і зноў горада не дасціг. Так паўтарылася яшчэ некалькі разоў, пакуль змораны турыст усё ж дабіўся да чаканага горада.

Праз тыдзень, вяртаючыся назад, амерыканец сустрэў першага ірландца, які даў яму несапраўдную інфармацыю.

— Што гэта мела абазначаць? — спытаў яго. — Вы сказалі, што горад за паўмілі...

— Вы выглядалі вельмі зморaным і я не хацеў вас турбаваць. Мы ўсе ў Ірландыі стараемся быць добрымі чужаземцам і падбадзёрыць іх.

— Але мы, у Амерыцы, трымаемся толькі праўды...

— З вамі, амерыканцамі, адна бяда толькі, — сказаў ірландзец. — Не хвалюецеся лёсам людзей настолькі, каб ім даваць такія інфармацыі, якіх яны чакаюць.

* * *

Муж па двух гадах турмы вяртаецца дадому, дзе жонка забаўляецца з немаўлём.

— Чыё гэта дзіця? — пытае.

— Маё. Але магло б быць і тваё, калі б так доўга не сядзеў у турме.

* * *

Пажылога мужчыну зачапляе на вуліцы паненка, ён адмаўляецца:

— Не-не, маё дзіця: я да любві маю вялікія патрабаванні...

— А мо я адпавядаю гэтым патрабаванням?

— Няма мовы! Я магу толькі дарма.

* * *

Прафесар да студэнткі:

— Ёсць дзве рэчы, якія перашкаджаюць вам дабіцца дасканаласці ў танцы...

— Якія?

— Ногі.

* * *

На прыёме пазнаёміліся два мужчыны.

— Я на колы свайго аўтамабіля, — кажа адзін, — закладваю цяжкія і цвёрдыя шыны. А вы?

— А я аддаю перавагу лёгкім і далікатным.

— Сапраўды? А які ў вас аўтамабіль?

— Зусім яго не маю, але часта пераходжу галоўную вуліцу, па якой ганяецца многа машын.

* * *

Бацюшка, ходзячы па калядзе, націскае дзвярны званок.

— Ці гэта ты, анёлку? — пытае з-за дзвярэй жаночы голас.

— Не, але я з той самай фірмы.

* * *

— Чым, суседка, корміце гэтую курыцу?

— А чаму гэтым цікавіцеся?

— Бо хачу пахудзець так, як яна.

Фота БАГУСЛАВА СКОКА

Музычная размова

Гурт „Сцяна" з Брэста добра вядомы публіцы „Басовішча". Сёлета ў Гарадку хлопцы выступілі трэці раз. Запамяталіся кожнаму безумоўна вялікай сцэнічнай энергетыкай, двума саксафаністамі і вакалістам падобным на Лявона Вольскага. Гавару з бас-гітарыстам і аўтарам слоў Андрусем Клімусам.

— ***Адкуль такі назоў групы, „Сцяна"?***

— „Сцяна" для нас гэта сімвал еднасці. Гэта не перашкода якую нельга разбурыць ці перайсці. Мы як цаглінкі ўсе разам.

— ***Як „Басовішча"?***

— Цудоўна. У мінулым годзе прыз ад Радыё „Палёнія" атрымалі. Тут свабода. Адчуваеш сябе свабодным, рабі што хочаш. Нейкія свае творчыя памкненні можна выказваць як хочаш са сцэны і паводзіш сябе як хочаш — свабода!

— ***Колькі гадоў гурту „Сцяна"?***

— У жніўні будзем адзначаць пяцігоддзе. Дакладна першага жніўня ў нас дзень народзінаў.

— ***За такі час можна запісаць ужо некалькі альбомаў. Як гэта ў вас?***

— Ну, зараз мы збіраемся пісаць новы альбом. Мінулы альбом „Рыфмы лёсу" выпушчаны на мінскай студыі „Лімас" пабачыў дзень гадоў два таму. Так што паўнавартасных альбомаў будзе два.

— ***А гэтых „няпоўнавартасных"?***

— Ой! Проста столькі разоў спрабавалі нешта запісаць, што губляемся ў тым усім.

— ***Часта канцэртуеце ў Беларусі?***

— Я б не сказаў, што вельмі часта — нам бы хацелася часцей. Колькі не выступалі б мы і так заўсёды хацелася б усё больш і больш.

— ***А дзе лепш працуецца, на сцэне ці ў студыі?***

— Усё ж такі лепш на сцэне. Тут бачна людзей для якіх ты працуеш, бачна як успрымаюць тваю творчасць. У студыі, усё гэта не так натуральна атрымліваецца.

— ***Пра што хочаш сказаць у сваіх тэкстах?***

— У прынцыпе пра ўсё. У нас акрэсленай тэматыкі няма. Пра жыццё, пра смерць, пра каханне, нават пра „Басовішча". Пра „Басовішча" песню мы стварылі на днях. Яна яшчэ недапрацаваная. Па сэнсе гэта падарунак „Басовішчу" на пятнаццацігоддзе.

— ***Ці ў Брэсце ёсць яшчэ акрамя вас беларускамоўныя гурты?***

— Ёсць, але яны даволі маладыя. Шмат і іншых гуртоў. Яны неблагія, але расійскамоўныя.

Татка Стэп

Музычныя навіны

У Маскве гурт „Ляпіс Трубяцкой" здымаў кліп. Будзе гэта самы дарагі і прафесіянальны відэакліп у Беларусі. Рэжысёр здымак — самы вядомы амерыканскі прадзюсар Кэвін Джонсан. Працаваў ён між іншым з такімі зоркамі як Грын Дэй ці Баста Раймес, накруціў многа рэкламных фільмаў.

А вось навейшыя інфармацыі з сайта гурту „Палац": — *Нам вельмі прыемна, што падчас нашых выступаў у Польшчы 7-8 жніўня, на канцэрце „Палаца" ў межах фэсту „Сустрэчы ў Мельніку над Бугам" прысутнічаў міністр замежных спраў Рэчы Паспалітай Польшчы Владзімеж Цімашэвіч. Дзякуем TV і прэсе за падтрымку і цёплыя словы. Асабістая падзяка кіраўніцтву Беларускага грамадска-культурнага таварыства.*

Як бачым, БГКТ пачынае „сцягваць" гурты з „Басовішча" (страшнае!). Ці сон гэта, ці нешта блытаецца ў салодкіх падстарэлых дзеячаў? Нам толькі весяліцца і, як „Палац", дзякаваць за падобныя рашэнні.

Татка Стэп

PS. Пачынаю верыць у нармальнасць некаторых людзей. **Т. С.**

Адгаданка

Гароднінная геаметрыя

(паліндрам)

На палетку агародніну
Расціў мастак-кубіст:
Пасадзіў эліпсай памідоры
__ / __ __ __ __ __ __ / __ __ __ __ __ __.

(ш)

Рашэнне паліндрама (у нашым выпадку з адзінаццаці літар) аднолькава чытаецца злева направа і справа налева.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, разыграем кніжныя ўзнагароды.

Рашэнне адгаданкі з 29 нумара

Бацькаўшчына.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

29.08 – 4.09

Баран (21.03. — 19.04.) Чакае цябе тэст на трываласць тваёй пары. Для народжаных паміж 10 і 14.04. можа быць ён зацяжкі. Але ці варта расставацца ў гневе? Бліснеш творчымі ідэямі.

Бык (20.04. — 20.05.) Каханне заслоніць табе ўвесь свет. Будзеш шчаслівы і ненасытны. Грошы знойдуцца самі, калі перастанеш аб іх клапаціцца. Рацыянальна еш, бо можаш хутка паправіцца.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Маладыя асобы, якія будуць пакідаць свой дом, каб ехаць па навукі ці працу ў іншай мясцовасці, могуць перажываць цяжкія дні. Асаблівы неспакой 30.08. Паможа хтось малазнаёмы ці сусед. Вучыся гаварыць „не". Шмат стрэсу.

Рак (22.06. — 22.07.) Варта ясна выказацца: шлюб ці расстанне. Каньюнкцыя Венеры з Сатурнам (29 — 31.08.) будзе патрабаваць сур'ёзных рашэнняў. Некаторыя Ракі захочуць павялічыць сям'ю. Можаш адчуваць болі ў касцях.

Леў (23.07. — 22.08.) Чакаюць цябе нештадзённыя эратычныя шаленствы. Марс спрыяе Львам асабліва з апошняй дэкады, падтрымліваючы дзеянні патрабуючыя рашучасці, а нават агрэсіі. На працы павінен ты даць рацыю іншым — ты ж не заўсёды беспамылковы! 30.08. пільнуйся, каб цябе не ашукалі.

Дзева (23.08. — 22.09.) Нявыключана, што паміж табою з кімсьці, каго ведаеш даўно, распаліцца каханне (магчыма, што завядзе яно вас пад вянец). Можаш выгарнуць усю праўду. Калі шукаеш працу, падумай аб іншай стратэгіі. Арганізм вельмі моцны.

Шалі (23.09 — 23.10.) Дадатковыя абавязкі, часам сваркі і непаразуменні. Новыя зацікаўленні, новая свая дарога. Сямейны лад. Поўня Месяца пагоршыць твой настрой. Можаш спаволіць тэмп жыцця. Добра было б якраз цяпер выбрацца ў адпачынак.

Скарпіён (24.10. — 21.11.) Лепш тры разы падумай, пакуль будзеш рашаць важныя справы. Новыя шанцы і магчымасці. Можаш брацца за планы з далёкімі мэтамі. У пастаяннай сувязі малы крызіс, які папсуе гармонію з партнёрам, сваркі з-за абы-чаго; толькі шчырая размова можа вылечыць сітуацыю.

Стралец (22.11. — 21.12.) Не выдавай грошай, якіх не зарабіў! Зацікаўлены табою хтосьці з суседства. Добры настрой можа папсавацца, можаш нават звесіць вушы; на гэта добры фізічны высілак.

Казярог (22.12. — 20.01.) Ахаладжэнне пачуццяў у пары. Рэалізацыя амбітных прафесійных планаў. Палягай на інтуіцыі і ўласных прадчуваннях. Слухай прыязных асоб, асабліва Рыб, Дзевы і Быка.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Ахвота распускаць грошы і не слухаць добрых парад. Ідылію могуць папсаваць спрэчкі з-за драбязы. Шчасце ў фінансах. Новыя магчымасці дзейнасці ў большым маштабе. Навучыся таймаваць злосць.

Рыбы (20.02. — 20.03.) Дэзарыентацыя ў тым, што можа быць для цябе найбольш карысным. Нейкая пераломная падзея. Калі кагосьці зводзіш і падманваеш — бо не ведаеш, на што ці каго рашыцца — чакае цябе непрыемны сюрпрыз! Можаш на працы здабыць тое, за што раней доўга змагаўся.

Агата Арлянская

ISSN 0546-1960